# *Пах чаромхі*

## Частка першая

1

«Не, яна не прыйдзе!» — зноў і зноў у думках паўтараў сабе Ігар, знішчаючы цыгарэту за цыгарэтай. Ён стаяў на пешаходным мосціку праз раку — адзінокі, нікому не патрэбны.

Горы Юра ўжо ледзь віднеліся ў вячэрняй сінаватай дымцы. Невялікі гарадок Аарау ўпускаў у дамы і кватэры загадкавыя агні. Нячутнай стралой распалавініў яго на роўныя часткі хуткі электрацягнік, што спяшаўся на спатканне з рэдкімі пасажырамі. Непадалёк падвіскваў ад задавальнення парк атракцыёнаў, які некалькі дзён назад падсяліўся да суседа — сумнага ў гэты час стадыёна, які яшчэ нядаўна атрымліваў асалоду ад шушукання красовак і енкаў звар'яцелага мяча.

Раскошліва, нястомна сцякаючы ўніз, нібы ўпіваючыся шчасцем, несла свае малочна-зялёныя вочы горная рака Аарэ, пакідаючы сваю моц і напор гарадской гідраэлектрастанцыі — адсюль, з мастка, яна здавалася старадаўнім гугенотаўскім замкам. Рака ж віравала далей, не звяртаючы ніякай увагі на закаханых. Тыя бесклапотна цалаваліся на недалёкім астраўку, сваёй формай падобным на сэрца. Здавалася, для зусім малодзенькіх юнака і дзяўчыны нічога важней не было ў свеце ў гэтыя хвіліны.

Ігар, аднак, нічога перад сабой не бачыў. Мужчына адчуваў сябе кепска. На душы было прыкра, нават агідна. Ён ненавідзеў сябе. Панура глядзеў у адну кропку — зманлівую зялёную ваду, на якой калыхаліся вячэрнія адбіткі горада.

Здавалася, Аарау быццам вырваўся з сярэдневечча і адначасова акружыў сябе з усіх бакоў сучаснымі жылымі гмахамі. Як толькі гэта магчыма? Ды і яму да гэтага горада якая справа?

Косціч праклінаў сябе за бяздумнасць, нават шаленства, дурное дзівацтва — як хочаш так гэта і назаві! — толькі нікому, у каго з галавой ўсё ў парадку, не давядзеш: чаму ён з такой лёгкасцю прыпёрся за трыдзевяць зямель?! Дарослы чалавек! А ў свае амаль

тры дзесяткі вычварыў такое, да чаго, мабыць, не дадумаўся б і семнаццацігадовы юнак. З якога боку не пакладзі на вагі — ну, абсалютны ідыёт!

Але недзе там, у самых патаемных сховах душы, заставалася надзея, што — усё ж! — дарэмна дачасу сябе выядае, не дурноту ж зрабіў. Мерыям — прыйдзе. Не можа не развітацца! Нават калі гэтая сустрэча — апошняя, калі растанне... назаўжды. Страшнае, балючае слова — назаўжды. Ды мужчына ведаў зараз праўду, цяпер — дакладна. І нічога не вернеш, не зменіш. Ні-чо-га!!!

Пакінулі, нарэшце, завяршыўшы свой чарговы круг, рамантычныя думкі, вярнуўшы яго ў рэальнасць. Калі працягваць думаць, што яна яго кахае, а яго, Ігара Косціча, сотні, тысячы раз спытай, і ён адкажа толькі так: яна яго кахае! Сэрца не падманіш. Толькі аднекуль раптам з›явілася — і гэта было нешта новае — ўсведамленне вартасці гэтага несамавітага кахання! Яно, яго нікому не патрэбнае каханне, можа скрушыць усё яе жыццё. Мерыям — часцінка гэтага чыстага ды толькі чужога яму свету! І інакш не можа быць. Пра што ён, шаленец, думаў, калі, згубіўшы галаву, ірваўся сюды? Ёлупень! Дзевяцігадовы сын, паспяховы ва ўсіх адносінах муж, перспектыўная праца — усё ў яе было. Што яшчэ, калі разважыць, неабходна для шчасця жанчыне? Ну, была рамантыка па-за сям›ёй. Ну і што з гэтага? Памылка... Бывае, а хто не грэшыць?!

Памылка?!

Нечакана Косціча ўзяў у палон дзіўны водар, на нейкае імгненне адцягнуў ад сумных думак. Устойлівы, хвалюючы пах быў такім знаёмым і адначасова, здавалася, новым... Толькі адкуль ён, што было гаючай крыніцай гэтага незвычайнага водару?

Ігар агледзеўся, але нічога не патрапіла на вочы. Азірнуўся: там, метраў за семсот, па шырокім мосце праз хуткацечную Аарэ, бясконцым ланцужком спяшаліся дадому, як здавалася ў вячэрнім мроіве, да такіх казачных, непадобных адзін на другі, нібы мастаком намаляванымі на прадгор›і, адна-двухпавярховых



домікаў, аўтамабілі. Менавіта першым прыцемкам аараўчане вяртаюцца дадому з работы. І... нічога болей — горад працягваў запальваць яркія агні. Але ж водар быў такім настойлівым, густым, напаўзабытым. І так добра Ігару вядомым. Ён закружыў галаву! Та-а-к! Божа, гэта ж пах яе любімых духоў!!! Ад яе ўчора, і тады, у Беларусі, зыходзіў такі ўстойліва-боскі водар...

Вярнуўся да рэальнасці: побач яе няма. І ніколі не будзе. Ён дарэмна чакае ўжо больш гадзіны. Дарэмна! Такая праўда!

Вада хвалявалася, пералівалася агнямі горада, прыцягвала да сябе, і Ігар, паддаўшыся чарговаму ўнутранаму памкненню, вырашыў спусціцца ўніз. Ён няспешна крочыў уздоўж ракі, па вузкай дарожцы для пешаходаў, бяздумна ўзіраўся ў вежы і вастраносы шпіль гідраэлектрастанцыі, які адсюль, знізу, здаваўся вышэй за горы.

Божа, вось яна, неспадзеўная крыніца гэтага густога чарадзейнага паху: чаромха, родная, расцвіла! Мужчына ўсміхнуўся: так і ёсць, яе час! Вясна... Нарэшце.

Толькі зараз ён адчуў, што дрэвы ў прадчуванні чагосьці незвычайнага, таго, дзеля чаго і варта жыць. На схілах берагоў густа ўвабралася гаспадыняй ярка-зялёная чарамша, з›явілася першародная зеляніна. Так, вось яна, самая сапраўдная вясна! І... яе вясенні букет боскіх пахаў — ад захапіўшай чарговай хвалі успамінаў стала надта горача.

На яго забрахалі — на залатым ланцужку сабачка прагульвала даму. Стрыжаная пад нуль, хударлявая, нібы жэрдка, мадам гадоў сарака — сарака пяці, відаць, не згубіўшая з гадамі ўсіх жаночых надзей, загадкава ўсміхнулася маладому чалавеку і злосна пацягнула мітуслівую жывёліну за кароткі ланцужок, даючы зразумець, што яна гаспадыня сітуацыі, а не наадварот. Маўляў, куды ты прэш!

Ігар з гаркатой усміхнуўся, азірнуўшыся ім услед: нават сабачка і той ясна адчуў у ім чужога гэтаму спакойнаму, да млосці, гарадка. Чу-жак!

На беразе гайдалася некалькі лодак, і ён забраўся ў адну з іх. Да берага прыбівалася беласнежная пена, Ігар пакратаў яе рукой.

Ён раптам адчуў, што ўпершыню менавіта гэтым надвячоркам на зямлю легла незвычайна мяккае цяпло. Было вільготна і адначасова душнавата, нягледзячы на тое, што рака абдымала свежасцю і прахалодай.

Косціч скінуў светла-бэжавы плашч, акуратна склаў яго на шырокі борт лодкі. У прыгаршню набраў халоднай вады, крыху прапусціў праз худыя доўгія пальцы, астаткамі жыватворнай вільгаці ахаладзіў разгарачаны твар. Рака, нечым падобная да роднай Прыпяці, супакойвала…

Але...

Што ён, малодшы навуковы супрацоўнік прыродаахоўнай установы, мог прапанаваць ёй? Інтэрнат у Мазыры? Пакой у бацькоўскім доме, дзе вырас? Абсурд. Наіўна нават думаць, што ў іх палескіх прыгод мог быць хоць нейкі працяг... Аднак — вось жа дурнеча! — ён верыў, што з ім адбылося — лёс, і сам Гасподзь падараваў ім тыя шчаслівыя хвіліны. Толькі не меў адказу на адно-адзенькае пытанне: чаму менавіта яму даравана такое — на значнай адлегласці — шчасце?!

А ўсё пачалося з экскурсіі...

Любімая стыхія: са школы мог гадзінамі захоплена расказваць пра свой родны край. Гэта ад мамы. Настаўніца яна ў яго. Ужо, праўда, на пенсіі.

Канешне, веданне ў яго нямецкай і англійскай мовы — далёка ад эталону, але Ігар мог свабодна гутарыць з турыстамі, ён няблага спраўляўся з абавязкамі гіда. Ён з задавальненнем выконваў гэтую работу!

Цяпер, амаль праз год Ігар лавіў сябе на думцы, што напачатку яе, высокую, сімпатычную жанчыну нават і не заўважыў, не выдзяляў з натоўпу. Адпрацаваўшы паўдня з адказнай групай турыстычных «бізнес-ледзі і манаў», толькі ў царкве Усіх Святых выпадкова ўгледзеў яе — сэрца адразу ёкнула...

Нейкае вар'яцтва дый годзе: толькі прайшоў дзень пасля яе адлёту Мерыям на радзіму, завяршаўся другі, як Ігару перашкаджала



нават дыхаць любая думка пра яе. Усё валілася з рук. Добра хоць, што шэф не паказваўся на працы. Пайшла гаворка ў аддзеле, што той узяў кароткачасовы водпуск і накіраваўся ў сталіцу рамантаваць скалечаны жонкай «мерс». Падначаленыя бралі на гэты перыяд тайм-аут, пачуваліся вальней. Таму ніхто на маўклівага хлопца, які адгарадзіўся паперамі, увагі не звяртаў. Так яму толькі здавалася!

Як Косціч памыляўся. Далёка не ўсе забыліся на яго існаванне. Паўнацелая, а таму, відаць, заўсёды добрая і вясёлая экскурсавод Лосікава, толькі сустрэўшыся вачыма з Ігарам, апякла праўдай: «Ну, Ігарок, нарэшце-такі! Закахаўся, як свет Божы, душачка! Па вачах бачу!.. Прызнавайся, хлопча, хто яна, дзе, а, галоўнае, — Лосікава кляцнула сваімі тоўсценькімі пальчыкамі па горле, — калі ж вяселле?»

Ён засаромеўся, пачырванеў і заспяшаўся, імітуючы, што яму неабходна некуды пайсці. Злаваўся з сябе: «Няўжо ўсё на твары напісана?» Але ў час спахапіўся, вырашыў падыграць Лосікавай. Шырока усміхнуўшыся, нібыта нічога і не здарылася, паведаміў: «У чацвер, Ганна Пятроўна!»

«Наша бабуля», як за вочы ласкава называлі Лосікаву ў двух аддзелах, бо справа яе падыходзіла да пенсіі, не зразумела падвоху, кінулася ўдакладняць: «А што ж, Ігарок, будзе ў той чацвер?»

Супрацоўнікі навуковага аддзела, і нават Васіль Ігнатавіч, лысаваты вучоны-біёлаг, які заўсёды лунаў недзе далёка ў сваіх думках, з цікавасцю глядзелі на іх.

Але Ігару цяпер было не да жартаў: схапіўшы са стала папку, дзе захоўваліся квартальныя справаздачы па рэкламнай дзейнасці і прагнозы, гулліва ўсміхнуўся Лосікавай, якая, нарэшце, здагадалася пра падвох: «Пасля дожджыку, у чацвер, наша вы дарагая Ганна Пятроўна! Прагноз хіба не чулі? Вось экскурсіі адменяць, рэкламную акцыю не трэба будзе закручваць, тады і...»

Не паспеўшы зачыніць за сабой дзверы, успацелы Косціч пачуў услед гром смеху, нястрымны бас Лосікавай і яе ласкавыя пагрозы на яго адрас: «Ну, пачакай, прыгажунчык! Знайду, чарцяня, я на

цябе хамут, ашчасліўлю. І для каго ён так сябе беражэ, а, бабы? (Васіль Ігнатавіч для амаль стопрацэнтнага жаночага калектыву быў у дошку свой, ніхто не звяртаў на ціхоню ніякай увагі, быццам і не было яшчэ аднаго мужчыны ў кабінеце, таму такі зварот тут не быў навіной!) Колькі вакол дзяўчат засумавала, прынцэсы выпісаныя, а наш усё нецалаваны матаецца. Ды мяне не правядзеш, як піць даць, закахаўся наш Косціч, вось пабачыце — мая праўда!..»

Ён — пакутаваў. І ніяк не мог дачакацца таго дня, калі там, у Швейцарыі, хоць хто-небудзь возьме трубку тэлефона! Як ён марыў пачуць яе голас! Але дарэмна. Ніхто не адказваў. Змянілі нумар?!

Блуканні па пакутах даліся ў знакі: Косціч кепска спаў, схуднеў, нерваваўся на кожным кроку. Але надзеі не губляў.

Нарэшце, перад самым каталіцкім Раством, у трубцы пачуўся дзіцячы голас. Петэр, яе дзевяцігадовы сын, не праявіўшы ніякай цікавасці, громка паклікаў маці.

— Добры дзень, гэта я... — пачаў ён нясмела.

Мерыям пачула яго голас, і, відаць, ад нечаканасці разгубілася, не змагла ці не захацела адказаць — раптам пачуліся кароткія гудкі. Гэта быў шок для Косціча!

Не прайшло і некалькі хвілін, як яна патэлефанавала сама.

— Ігар... Усё было проста цуд... Але гэта — памылка. Я не мела права пакідаць табе хоць маленькую надзею. Прабач. Ты вельмі добры, прыняў усё, што было з намі, за чыстую манету. Я ж не кахаю цябе. І забудзь мой тэлефон. Я даражу сваёй сям›ёй, зразумей, не звані сюды больш ніколі...»

Абвалілася пад нагамі зямля. Хвілін з пяць Ігар стаў ля акна і трымаў ва ўспацелых руках трубку, з якой сыходзілі кароткія гудкі.

«Як жыць, што рабіць з гэтым прыдуманым каханнем? Рамантык дурны!»

Тады быў вольны ад працы дзень. Ігар гасцяваў у маці, але спакою дома так і не знайшоў. А мама, мілая яго матуля, адносілася да дарослага сына, як да малога дзіцяці. Хіба ж не заўважыла яна сынавы пакуты? Звялася зусім, моўчкі перажываючы — ён бачыў



гэта і паспяшаўся з'ехаць на працу. Каб толькі ведала яна, умудроная вопытам настаўніца-пенсіянерка, чым яму дапамагчы. Не, вырашыў Ігар, лепш не непакоіць дарагога чалавека, не турбаваць...

Гарэзлівыя вочы Косціча патухлі. Ігар прымусіў сябе больш не тэлефанаваць у Швейцарыю. Чагосьці чакаў. Чаго і сам не ведаў. Думкі займаў работай, яго адзначаў шэф на нарадах. Ды нічога не радавала, зусім не грэла, зусім нічога.

Праляцелі доўгія месяцы. І раптам...

Усё адбылося так хутка! Прададзены амаль за так патрыманы аўтамабіль «Аудзі», куплены па сходнай цане адразу пасля ўніверсітэта. Стары, але добры быў аўтамабіль... Адпускныя таксама пайшлі на тыднёвую пуцёўку ў краіну банкаў, сыру, гадзіннікаў і шакаладу, прапанаваную амаль выпадкова аднагрупнікам, што прыстроіўся ў Мінску ў салідным ведамстве: ехаць таму не выпадала.

Група засталася ў Цюрыху — за невялікую кампенсацыю і слова гіду вярнуцца назад своечасова. Праз некалькі гадзін Ігар Косціч стаяў на чыгуначным пероне маленькага кантанальнага Аарау. Ён, дзякуючы расповядам Мерыям і інтэрнэту, ведаў амаль усё пра гэты горад, дзе жыла жанчына яго мары. Толькі...

Ну і навошта, каб хто спытаўся, навошта ён уварваўся сюды, у яе свет? Хто яго зваў?!

## 2

Гэта быў азнаямляльны тур вядучых турфірм Еўропы ў рэспублікі былога сацлагера. Калі шэф выклікаў Мерыям Хойслер да сябе і нечакана прапанаваў двухтыднёвую азнаямляльную паездку ў невядомыя ёй Украіну і Беларусь, новая супрацоўніца засвяцілася ад шчасця.

Мерыям да гэтай паездкі была ўсяго толькі шэранькай архіўнай мышкай-справаводам у гэтым маленькім філіяле аўстрыйска-нямецка-швейцарскага холдынгу, турызм для якога быў толькі нязначнай, далёка не профільнай часткай дзейнасці і даходаў. Плысці ж на другіх, а то і на трэціх, як кажуць, ролях, яе поўнасцю

задавальняла, нягледзячы на ўніверсітэцкую адукацыю гісторыка па Усходу і даволі някепскае валоданне рускай і англійскай мовамі, якія, як і адукацыя, амаль ніколі ў жыцці Мерыям не спатрэбіліся.

У дваццаць гадоў, яшчэ ў час вучобы ва ўніверсітэце, бацькі дамагліся ад яе, адзінай дачкі, згоды на замуства. Сяброўкі Мерыям надта здзівіліся яе выбару, нават скептычна аднесліся да такога раптоўнага і ранняга шлюбу, пасля якога і сяброўства неяк само па сабе расклеілася. Дзяўчына сумавала па сяброўках, але ж ці магла што зрабіць не так?! Насуперак бацькам — яны ж выглядалі вельмі шчаслівымі! Дачка як магла змагалася, каб вызваліцца канчаткова ад іх надакучлівай, назойлівай апекі, імкнулася ўсё больш да самастойнасці. І між імі, асабліва Мерыям і маці, чамусьці з кожным днём вырастала сцяна непаразумення. Аднойчы маці, зазлаваўшыся, накрычала на яе: «Зноў твая дурная кроў бесіцца!» А Мерыям гэта пакрыўдзіла, балюча раніла сэрца. Толькі ж хіба можна так доўга крыўдаваць на родную маці, яна ж — самы дарагі чалавек на свеце!

На жаль, маці перамагла: даччынае імкненне да самастойнасці спатыкнулася аб шлюб. Тут быў звычайны разлік, і ніхто гэтага не хаваў нават. Мерыям з дзяцінства ведала свайго абранніка. Старэйшы амаль на дзесяць гадоў, празмерна рыжы і рабацiністы хлопец, які, ёй здавалася, неразумна-смешна лыпаў маленькімі вочкамі праз кругленькія акуляры, рана ці позна, але абавязкова стане яе мужам. І ніхто іншы! Гэта было літаральна ўвагнана ў падсвядомасць малой дзяўчынкі рэлігіёзнай фанаткай-маці. Супраціўляцца? Справа няўдзячная, без карысці. Усё вырашана наперад. І нават у такіх умовах яна спрабавала не падпарадкавацца маці...

Хойслеры даўно лічыліся добрымі сябрамі нябедных, але так атрымалася цяпер, не вытрымаўшых канкурэнцыі з еўрапейскімі сельгасвытворцамі і, пры адстутнасці дзяржаўнай датацыі, збяднелых фермераў. Яны валодалі буйной сеткай будаўнічых кампаній і дробных даччыных філіялаў і фірм у Люцэрне, Цюрыху і Берне. Адпаведна, як разлічвала маці, занепакоеная будучыняй дачкі, дастатак нашчадка Хойслераў дазваляў яго выбранніцы



пазбавіцца клопатаў пошуку сродкаў на існаванне, а поўнасцю аддаць сябе выхаванню немаўляці, што з'явіцца на свет божы ў свой час пасля шыкоўнага вяселля.

Разлік спраўдзіўся. Так і было. Кропка ў кропку.

Муж, да слова, заўсёды быў уважлівы да Мерыям, хаця ж дваццаць чатыры гадзіны ў суткі курсіраваў па гарадах краіны і за межамі. Бізнес — яго жыццё, куды жонцы доступу не было. Ну, і што ж тут новага? Для бізнесмена, увогуле дзелавога швейцарца, як і для любога еўрапейца — звычайная справа. З такімі жыццёвымі абставінамі маладая жонка таксама змірылася і аднойчы нават пераканала сябе, нават паверыла, што мужа свайго, Гюнтэра, усё ж такі кахае. Звычка зрабіла сваё...

Універсітэт Мерыям закончыла вельмі добра, але, шчыра кажучы, асабліва не перанапружвалася на апошнім курсе, і, маючы жаданне, магла б знайсці прымяненне свайму дыплому і ведам. Толькі ж муж стаяў на сваім: катэгарычна супраць працы жонкі. Дом ёсць дом, спадарыня Хойслер!

Месяцы зліваліся ў гады, сын падрастаў, і Мерыям паціху стала задыхацца ад адзіноты і бяздзейнасці. Аднойчы, набраўшыся смеласці, запатрабавала-такі ад мужа, каб той куды-небудзь яе ўладкаваў, хаця б у пачатковую школу. Для ўсюдыіснага Гюнтэра, у якога, як лічыла маладая жонка, было цікавае, у адрозненне ад яе, хатняй гаспадыні, жыццё, гэта не складала ніякіх праблем: ён меў сяброў, здавалася, паўсюль. І ў дэпартаменце адукацыі, культуры і спорту таксама. Аднак яе напаткала горкае расчараванне. Твар Гюнтэра наліўся крывёю, ён упёрся, як бугай на іспанскай карыдзе: «Прыдумала! Я не дазволю працаваць сваёй жонцы! Мяне ніхто не зразумее!..» На гэтай глебе ў сям'і не на жарт разгарэўся скандал. Спрэчкі не спыняліся амаль тыдзень. І — вада камень крышыць — пакруглелы з гадамі Гюнтэр зразумеў, што нічога не даб'ецца па-добраму, здаўся. «Рабі што хочаш! Але толькі ў нашым гарадку шукай, ніякага там Базеля ці Цюрыха!»

Узрадавалася Мерыям, бясспрэчна, дарэмна. Без мужавай падтрымкі нічога не атрымлівалася. Уладкавацца ў шаснаццаці-тысячным кантанальным гарадку без практыкі па спецыяльнасці —

немагчыма, нават з яе ўніверсітэцкай адукацыяй. З кожным днём жанчыну пакідала надзея, апускаліся рукі, а яе мара вось-вось, здавалася, абурыцца, як картачны домік.

У адзін з дзён шчасце, аднак, не пакінула яе: выпадкова на вочы трапіўся філіял фірмы, якой на сорак працэнтаў (некалькі гадзін у дзень) спатрэбіўся канцылярскі работнік, каб, для пачатку, прывесці ў належны стан архіўныя справы, а затым выконваць невялікія даручэнні па перакладу дзелавой карэспандэнцыі на нямецкую мову. Мадам Хойслер узялі на працу без усякіх абмежаванняў у кантракце, толькі пабачыўшы дыплом і пераклад, зроблены ёю у час субяседавання.

Новы занятак Мерыям прыйшоўся па душы, і яна аддалася яму з уласцівай ёй адказнасцю. Праз нейкі час стараннай, акуратнай работніцы начальства стала давяраць больш сур›ёзную работу. Гюнтэр, нарэшце, пагадзіўся, што праўда была на яе баку — жонцы даўно трэба было даць магчымасць рэалізаваць сябе ў прафесіянальным накірунку. Ранейшы мір вярнуўся ў сям'ю.

А ці магла марыць аб такой прапанове калі-небудзь мадам Хойслер? Муж у свой час рашуча адмовіўся ад паездкі ў Расію, лічыў яе дзікім краем зямлі, з жудаснымі традыцыямі і бязбожным п'янствам. А яна гэтак марыла пра краіну, якую толькі завочна ведала па кнігах! І цяпер у нейкай ступені даўняя мара знаходзіла сваё ажыццяўленне. Няхай гэта зусім не Расія, але ж так блізка каля яе незалежныя Украіна і Беларусь, што некалі цэментавалі аснову сусветнага палітычнага гіганта — СССР.

Мерыям Хойслер адчувала сябе ў сваёй стыхіі: Вялікая Кіеўская Русь ажывала ў яе ўспамінах. Са здзіўленнем і нейкім благадзенствам адкрывала для сябе святыя месцы славянскай цывілізацыі — Кіева-Пячэрскую лаўру, праваслаўныя храмы, услухоўвалася ў дзіўную украінскую мову, адрозную ад рускай, багацце мясцовага каларыту. Побач суседнічалі запушчаная зямля, пустэча, адміраючыя вёскі...

Услед за Украінай адкрылася іншая, зусім новая для яе зямля — Беларусь. Белая Русь. Яна мала што чула аб гэтай маладой краіне,



хіба толькі тое, што мясцовы лідар не ў пашане ў аб›яднанай Еўропы, а швейцарскія палітыкі ў адзін голас называюць яго другім Фідэлем Кастра, што частка гэтай краіны забруджана Чарнобылем. І ўсё. Зусім незнаёмымі былі для яе назвы гарадоў. З неверагоднай асалодай, літаральна зачаравалася таямнічым Гомелем, прыгожым і дагледжаным, назірала за ўсмешлівымі людзьмі, што жывуць тут. Жывуць, нягледзячы на дваццацігадовую чарнобыльскую праблему. Моцны народ, варты павагі! Яна адчула да беларусаў такую любоў...

Зачараваў і захапіў палац ў сэрцы Гомеля і такі мілы драматычны тэатр. Колькі новых адкрыццяў яе чакала наперадзе, пра якіх і здагадацца было цяжка! А якія прыгожыя рэкі апяразаюць гэтыя землі — Днепр, Сож, Прыпяць... Дзіўныя назвы!

Гэтакі ж і Мазыр, размешчаны на ўзгорках, утульны і ціхі гарадок, дзе заўважная старадаўняя месцячковасць і нястрымны сучасны рытм жыцця. А ў дадатак...

А ў дадатак...

Страшна нават прызнацца — гід, сімпатычны малады чалавек, захоплены апавядальнік, з некалькі непрывычным вымаўленнем, але даволі няблага тлумачыў англічанам і немцам, што гэты гарадок лічыцца ў Беларусі сваёй маленькай Швейцарыяй, захапіў усю яе ўвагу. Ігар, так, здаецца, яго завуць, эрудзіраваны экскурсавод — здавалася, ён ведаў літаральна ўсё аб сваіх родных мясцінах. Ён расказваў неверагодныя, амаль казачныя легенды і падкупляў сваёй дабратой і ўсмешлівасцю іншаземцаў. Мерыям была зачаравана ім з першага погляду.

За вокнамі турыстычнага аўталайнера адлівалі першапазалотай дрэвы, а ў салоне так рамантычна і натуральна гучалі незабыўныя радкі вялікага рускага: «Осенняя пора, очей очарованье...»

Гід быў непараўнаны ні з кім, проста выключны!

Дзесьці ў палескай глыбінцы было арганізавана падарожжа на цеплаходзе «Кірыл Тураўскі» па дзіўнай сінявокай рацэ Прыпяці. Мерыям адчувала сябе нібы дома: утульна, камфортна. Да таго ж, прыйшлася даспадобы мясцовая кухня. Хойслер па-дзіцячы

непасрэдна скакала ад задавальнення, смакуючы смачнезныя блінцы з разынкамі. Яна з'ела іх некалькі і нават запісала, як мясцовае дзіва, рэцэпт у свой дарожны дзённік. Назва стравы гучала па-беларуску «наліснікі», і яна вывучыла з беларускай мовы гэтае слова першым. Надта было смачна!

Дзіўная справа: ёй усё навокал здавалася такім блізкім, такім родным, як быццам тут была і не чужой. Кожная зямля мае сваё хараство!

Тым часам, усе жадаючыя маглі расслабіцца і іначай: выпіўкі і закусак было ўдосталь — гаспадары з адкрытай душой, шчодра, як самі гаварылі, па-славянску і па-паляшуцку, выконвалі ўсе просьбы і пажаданні замежных гасцей. І рабілася ўсё невыказна прыгожа!

Прыхіліўшыся да борта на палубе, Мерыям ціха гутарыла з Анітай, супрацоўніцай магутнага холдынга з Берліна. Аніта была ненамнога старэйшай, аднак гэта зусім не перашкодзіла жанчынам пасябраваць у час паездкі. Руская гарэлка зрабіла сваю справу: праз нейкі час усе вакол зашумелі, аглядаючы цудоўную, некранутую рукой чалавека маляўнічую прыроду. Толькі ж размова з Анітай была не галоўным для Мерыям: яна ўкрадліва назірала за гэтым высокім светлавалосым мужчынам — «белым русам».

«А ён усё ж такі чартоўскі прыгожы!» — адзначыла ў думках яна ў чарговы раз. Некалькі афіцыйны, але даволі модны светла-бэжавы плашч добра спалучаўся са строгім класічным касцюмам. Вецер пранізваў статную фігуру гіда, падкрэсліваючы яго спартанскі целасклад. А яго дзіўныя блакітныя вочы? У іх, здавалася, можна патануць, як у глыбокай Прыпяці ці яе роднай Аарэ, нечым падобнай да мясцовай ракі. А амаль дзіцячая, наіўная ўсмешка?..

«Колькі яму? Пярсцёнка на руцэ няма, значыць, не жанаты. А, можа, разведзены?..»

Нядзіўна, што не адстае ад гэтага прыгажунчыка, літаральна не даючы яму праходу, кіраўнік групы з Бона Інгрыт Умлаўт — гады яе павярнулі на старасць, аднак, як ранкам шапнула на вуха Мерыям усюдысная Аніта, не да канца спазнала Умлаўт у маладыя гады ўсе



радасці. Аніта і зараз нечакана ўключылася ў яе думкі, нібы разгадала што: «А гід наш, скажу табе па-дзявочы, нішто сабе. Як лічыш?» Мерыям нешта няўцямна адказала, і, быццам яе астудзілі халоднай вадой, адхілілася. Няўжо новаспечаная сяброўка заўважыла яе заінтрыгаваныя позіркі на мужчыну? Выратаваў званок на мабільны тэлефон — папрасіла прабачэння і хутка адышла прэч, каб адказаць Гюнтэру. Хто б ведаў, як сорамна стала Мерыям за свае думкі і як своечасова выратаваў муж ад гэтай напасці! Выратаваў? Ад чаго?!

... Голас гіда хваляваў.

«Тураўшчына — найбагацейшы ў Беларусі гісторыка-культурны край, які заселены чалавекам у восьмым-пятым тысячагоддзі да нашай эры. У бронзавым веку, у другім-пятым тысячагоддзі да нашай эры, месцічы ужо займаліся земляробствам. У вузкай паласе правабярэжжа Прыпяці выяўлена больш сотні археалагічных помнікаў: пасяленні старажытнага чалавека, курганныя і бескурганныя могільнікі, рэшткі найбуйнейшай у Беларусі стаянкі чалавека жалезнага веку. У канцы дзесятага стагоддзя славянскія плямёны дрыгавічоў утварылі тут удзельнае княства, сталіцай якога у X-XIII стагоддзях з'яўляўся Тураў. Гэта быў магутны ва ўсходніх славян палітычны, эканамічны, культурны і рэлігійны цэнтр. У гэтым горадзе у дванаццатым стагоддзі жыў і тварыў адзін з самых адукаваных людзей сваёй эпохі — паэт, філосаф, асветнік і прапаведнік епіскап Кірыл Тураўскі. Зараз мы падплываем да гэтага цудоўнага старажытнага горада, які пераліжыў вельмі шмат у сваёй тысячагадовай гісторыі, і ўжо на беразе дакранёмся да яго святыняў...»

Мерыям ледзьве стрымлівала сябе — так хацелася загаварыць з гэтым хлопцам. Толькі як падысці, што спытаць? Аднак назойлівая думка не давала ёй спакою. У тое ж імгненне, ідучы побач, жвавая не па гадах Інгрыт Умлаўт, як сваім сяброўкам, недвухсэнсоўна кінула: «Дзяўчаты! Сюды ездзіць еўрапейскім жанчынам трэба хаця б ужо дзеля таго, каб паглазець на мясцовых асобін мужчынскага полу! Цікава, а якія яны як... самцы?!»

Тройка жанчын хіхікнула, прыцягваючы ўвагу да сябе. Умлаўт была недалёка ад ісціны: жаночая палова тургрупы сапраўды зачаравана гідам, і многія не хавалі гэтага. Чым жа ты так прыцягальны, хлапчына?!

... Каля царквы Усіх Святых у Тураве Мерыям адчула чужы позірк, які настойліва вывучаў яе. На нейкі час гід перадаў свае паўнамоцтвы мясцоваму экскурсаводу і настаяцелю царквы, а сам стаяў ля царкоўнай агароджы і курыў. Мужчына быў нечым незадаволены. І раптам іх позіркі сустрэліся...

Ён незаўважна падышоў да яе і ціха прашаптаў на вуха: «Можна я вас скраду?»

Мерыям разгубілася, калі прыгажунчык-гід уладна завалодаў яе рукой. Неверагодна, але яна падпарадкавалася мужчыне.

Ішлі зусім не спяшаючыся, аддаляючыся ад групы, і яны абодва не ведалі як пачаць размову. Побач былі праваслаўныя могілкі, магілкі межаваліся багатыя і ўбогія. Ля царквы, падумала жанчына, хутчэй за ўсё хавалі вядомых тут людзей. Хацела пра гэта спытаць, але не змагла набрацца рашучасці, ніяк не знаходзіліся патрэбныя словы. Разгубіўшыся, як студэнтка на першым спатканні, яна не ведала пра што гаварыць з гэтым загадкавым «белым русам». А той, у сваю чаргу, быў захоплены ў палон водарам яе духоў, такога знаёмага вясенняга букету ў восеньскай смузе.

Ён нервова закурыў. І адразу ж кінуў. Раптам рашуча павярнуўся да яе, а яна — да яго. Абодва ў адно і тое і ж імгненне зірнулі адзін аднаму ў вочы, прамовілі:

— Скажыце...

І — узарваліся ад смеху.

Што ж, гэта было менавіта так. Напачатку ён завалодаў яе душой як гід-прафесіянал: здавалася, не было ніводнага пытання, на якое ў хлопца не знайшлося б адказу. Мерыям з ахвотай слухала легенду аб князі Туры, ад якога і «туровцы прозвашася», у яе галаве змяшаліся неверагодныя, амаль казачныя мясцовыя гісторыі. Ва ўсласным уяўленні яна ўжо малявала старажытны горад, які



спальвалі вераломныя татары, а на Барыса-Глебскіх могілках схіліла калені перад крыжом, які рос з зямлі, нібы грыб — месцам паломніцтва і ўшанавання праваслаўных хрысціян. Мерыям не хацелася з гэтага смяяцца, хаця, нягледзячы на рэлігійны фанатызм маці, была як і бацька — атэістка. І ніколечкі, як бы маці ні старалася прыцягнуць яе да веры, не паддалася яе ўгаворам. Хаця ж усе рэлігійныя традыцыі захоўвала, і на вялікдзень разам з маці ішла ў пратэстанцкую царкву. Раз у год. Мясцовая ж святыня — дзіўны крыж — не выклікала асаблівага даверу, але Мерыям разважыла так, калі людзі веруюць хоць у нешта, хіба гэта так кепска? Тым больш, што яна на свае вочы бачыла, што жыццё ў Беларусі цяжкое, але стала наладжвацца, і краіна гэтая не нейкая там рэзервацыя, калонія, як распісвалі «жывапісцы» ад журналістыкі ў швейцарскай прэсе, а пакрысе становіцца нармальнай еўрапейскай краінай. Не адразу, канешне, не ўсё атрымліваецца, не ўсё атрымліваецца з-за таго, што засталося ў спадчыну ад камуністычнай сістэмы.

Яна чамусьці ўсё больш праводзіла паралелі паміж гэтай краінай і сваёй. Што было б са спакойнай нейтральнай Швейцарыяй, калі б на яе лёс выпала столькі гора, як беларусам? Хто ведае. Яна разумела, што яе грамадства перасыцілася і даўно, а за краем уяўнай сытасці ці не чакае яго бездань?! Пасля любых прэзідэнтаў, якія прыходзяць да ўлады і сыходзяць, застаюцца людзі. Са сваімі звычайнымі жыццёвымі праблемамі. Іх — праблем — у гэтай Белай Русі — нямала. Драўляныя вёскі, адноўленыя наспех пасля такой жудаснай чатырохгадовай вайны... Чаму калі не дапамагчы, то хаця б паспачуваць таму, каму кепска? І каму яны, да прыкладу, амаль за дзесяць гадоў сумеснага з Гюнтэрам жыцця, дапамаглі хоць нечым? Жылі сваім сытным жыццём... Гэта ж няправільна, не па сутнасці чалавечай!.. Ратавальны крыж пакінуў след у яе памяці надоўга. Казка? Патрыярхальнасць? Хаця ж... Хіба кепска, калі і гэта людзям дапамагае выжываць?

Мерыям прымала ўсё ўбачанае блізка да сэрца. Нават маці нярэдка папракала яе, што дачка — не такая, як усе, кожнага можа

пашкадаваць і абагрэць. Чаму яна заўсёды так балюча яе раніць, завошта?

Ігар, як аказалася, таксама быў атэістам, і гэта яшчэ болей іх зблізіла.

Ён працаваў, як мог забаўляў турыстаў, і час ад часу паглядаў на яе з хваляваннем, у бездані яго блакітных вачэй нібы зоркі ўспыхвалі. Мерыям адчувала сябе разгублена, але былі так прыемныя знакі ўвагі маладога чалавека, і ўсё вакол хвалявала яе, да ўсяго была цікавасць, усё было новым. Ніколі яшчэ раней яна не адчувала сябе гэтак.

А пасля вячэры ў рэстаране яшчэ аднаго незнаёмага ёй горада з падобнай да беларускай сталіцы назвай, не менш старажытнага, чым Тураў і Давыд-Гарадок, куды нарэшце дабраліся позна, гід зусім нечакана пастукаўся да яе ў нумар і проста запрасіў прагуляцца па начным парку перад сном.

— Я стамілася, Ігар, прабачце, такі цяжкі пераезд...

Яна і сапраўды збіралася прыняць душ, пастарацца сабраць у адно цэлае свае ўзбуджаня эмоцыі, і — спаць, спаць, спаць...

Мужчына быў няўмольны.

— Пяць хвілін нічога не зменяць, начны Пінск асабліва прыцягальны, раніцай — не тое!..

Ігар у словы ўклаў усе свае мужчынскія чары, што яна здалася.

— Але толькі на пяць хвілін, абяцайце!

— Канешне, толькі на пяць хвілін!

Хіба можна застацца раўнадушным перад націскам гэтых бяздонных вачэй?..

Вярнуліся ж яны ў гатэль далёка за поўнач, зачараваныя незямной страсцю, якая захапіла іх. І разам накіраваліся ў душ. Тут жа заняліся каханнем. Яно бруілася зноў і зноў, прызнаваючы адзінае права на важную акалічнасць, што гэтыя людзі створаны адно для аднаго. Ігар і Мерыям на нейкі час зусім забыліся аб усім на свеце і не думалі пра заўтрашні дзень.

О Божа, Мерыям дагэтуль не ўяўляла, што такое можа быць з ёй!



Наступны дзень прайшоў да жудасці цяжка. Ігару ўсё ж такі прыйшлося працаваць, а яго позіркі, напоўненыя каханнем і пяшчотай, папярэджвалі аб шчасці, якое, без сумніву, прыйдзе ноччу ў нумары сталічнага гатэля «Мінск».

Яны плакалі ад кахання і цяпер ужо ад хуткага расстання.

Раніцай, прачнуўшыся, Мерыям сказала:

— Нас раздзяляў цэлы свет, але ты змяніў мяне.

— Я не ведаю, як цяпер жыць без цябе...

Мерыям ласкавала дакранулася сваімі тонкімі пальцамі да яго светла-русых валасоў, затым абхапіла рукамі галаву мужчыны, ён быў падатлівы, і прыціснула да сваіх грудзей, у якіх пачуліся першыя ўсхліпы.

— Я таксама... Не ведаю, як мне жыць цяпер. Толькі ты мяне не праводзь...

— Чаму ты такая жорсткая?

Яго блакітныя вочы-хвалі рабілі яе мяккай.

— Давай развітаемся тут... — Мерыям незаўважна выцерла слязінку. — Так будзе лепей для нас абодвух. Зразумей, у групе нічога бясследна не здараецца, і нас не маглі не заўважыць, нашы... Ты ж памятаеш, я — замужняя жанчына...

— Замужняя жанчына... — прастагнаў Ігар. — І гэта ніяк нельга змяніць?

Яго ахапіла жудасць.

— І гэта ніяк не зменіш...

Яна пацалавала яго на развітанне, не ведаючы нават, што можа так цалаваць. Адкуль гэта ў ёй, няўжо дагэтуль драмала ў сутарэннях душы?! Навошта гэтыя новыя пачуцці, адчуванні забралі яе спакой?

— Даруй і ідзі. Няхай наша гісторыя закончыцца на добрай ноце. Я хутка збяру рэчы, хутка ў аэрапорт...

Так, яму трэба было ісці. Толькі як прымусіць сябе гэта зрабіць — Ігар нерашуча застыў каля дзвярэй. Ён зірнуў на яе, у вачах былі каханне і боль.

— І ты мне даруй, каханая. Страшна так сыходзіць...

— Ігар, не трэба больш нічога казаць...

— Бывай. Аднак мы яшчэ сустрэнемся!

Ён сказаў гэта з такой упэўненасцю, энтузіязмам і выйшаў. Мерыям заплакала ўслед.

... Агромністы, нібы цяжарны, «боінг» доўга выруліваў на ўзлётную паласу, потым набіраў разгон, рухавікі дыхалі натужліва і хрыпла. І вось яна ў паветры. Унізе застаўся доўгі шэры будынак мінскага аэрапорта, некалькі беласнежных лайнераў, аўтобус, які даставіў на пасадку рэдкую тут групу турыстаў... Беларусь яна пакідала назаўсёды, краіну, якая падарыла ёй незямное каханне. Мерыям звозіла яго ў сабе, схаваўшы назаўсёды ў сваім сэрцы. У гэтую хвіліну — дай ёй волю — яна магла б разраўціся і кінуцца назад, да яго... Яна ж усяго толькі слабая жанчына!

Як ні старалася стрымліваць сябе, няпрошаныя здраднікі-слёзы вырваліся на паверхню, і, адвярнуўшыся да ілюмінатара, Мерыям разгублена падумала, што цяпер не ведае, як жыць далей. Як наогул магло здарыцца такое з ёй? Як сталася так, што просты беларускі хлопец, не маючы нічога акрамя фізічнай і душэўнай прыгажосці, дапамог ёй усвядоміць яўнае: Гюнтэра яна ніколі не кахала і ніколі не пакахае?! І муж, напэўна, таксама. Яна зразумела, нарэшце, простую ісціну: Гюнтэр прыняў яе, таму што не мог спрачацца з бацькамі. Ён таксама яе не кахаў ніколечкі! Нормы маралі швейцарскага грамадства, прадусім, гэтага і не патрабавалі. Ад такога адкрыцця Мерыям стала яшчэ горш...

3

...Пераначаваўшы ў прыватным пансіянаце, роўна ў восем раніцы Ігар набраў нумар тэлефона, які вывучыў напамяць. Выспеў план. Калі нехта адкажа іншы, а не Мерыям, Ігар назаве сябе супрацоўнікам турфірмы з Цюрыха. Аднак тэатральнічаць не давялося — адказала Мерыям! Яе голас быў стомленым. Жанчына, адчувалася, доўга не магла паверыць, што размаўляе з тым самым Ігарам, з якім яе столькі звязвала.



— Ты ў Аарау? — гаварыла яна ціха, нібы спалохана.

— З турыстычнай групай, па пуцёўцы. Пашанцавала, гарэла... — Ігар гаварыў усхвалявана, трохі нервова.

— З самага ранку ў мяне няма вольнага часу. Мне трэба ў бальніцу, а потым...

Яна раптам замаўчала, нібы сустрэла перад сабой перашкоду.

— Ты хворая? — устрывожыўся ён.

— Не, проста ёсць неабходнасць...

Яна адказвала хутка, быццам баючыся, каб ніхто не пачуў — Ігар гэта адчуў адразу. І сапраўды, у слухаўцы пачуўся незадаволены мужчынскі водгалас: «Мілая, ты хутка? Не займай тэлефон, Рэнэ будзе званіць!»

Ігар адчуў сябе нядобра, пачуўшы гэта.

— У дванаццаць, у цэнтры горада, там знойдзеш мой любімы рэстаранчык...

Яна паведаміла адрас і паклала трубку.

— Я буду чакаць...

Ігаравы словы Мерыям ужо не пачула.

Косцічу амаль не прыйшлося шукаць месца прызначанай сустрэчы. Рэстарацыя аказалася побач, з магутным бронзавым арангутангам ля ўваходу і экстравагантнай назвай. Ігар доўга шукаў беларускі адпаведнік, і, нарэшце, у выніку лагічнай высновы, зразумеў, што гэта «Шафа для малпаў». Ён заказаў піва, а затым больш гадзіны блукаў па старадаўніх, выкладзеных брусчаткай, вуліцах трох-чатырох павярховага гістарычнага цэнтра Аарау.

Тое, што ён некалькі месяцаў таму бачыў на фота ў інтэрнэце, ажывала наяве — цудоўны пратэстанцкі храм, які, як яму падалося, некалі служыў каталіцкай рэлігійнай канфесіі, ратуша, маленькія і вялікія рэстарацыі, шматлікія помнікі, краязнаўчы музей са стылізаваным вадзяным млыном, агромністы кніжны гандлёвы дом, фотавыстава аб сённяшнім дні шматпакутнага афганскага народа... Усё дзіўна памяшчалася на такой маленькай тэрыторыі. Патрыярхальна буркавалі галубы, па-гаспадарску асвоіўшы чарапічныя дахі. Ціхае жыццё старажытнага гарадка...

Ён не мог не пазайздросціць месцічам — захавалі ж праз стагоддзі дух даўніны! І шкадаваў радзіму, дзе амаль усё за мінулыя стагоддзі знішчана войнамі, затым зрабіла сваю чорную справу эпоха бальшавізму. Несправядліва, але ж не павернеш, не адкруціш час назад. Жудасны факт. Толькі загінула не ўсё, паказаць турыстам яшчэ засталося што. Пакуль...

Напачатку Ігар засяроджваў увагу на ўсім, што бачыў, але паціху ў думках аддаляўся ад горада і яго харaства. Ён раптам усвядоміў адно: Аарау цікавы яму толькі тым, што менавіта тут жыве дарагі яму чалавек. Зразумеўшы гэта, захваляваўся, ніяк не мог дачакацца, калі на ўсю моц загучаць званы ва ўсіх цэрквах, вялізны гадзіннік на гарадской ратушы пачне адбіваць роўна дванаццаць раз.

... Ігар знерваваўся, калі ўваходзіў у рэстаран. Мерыям — яе ўбачыў адразу — размясцілася ў кутку, далей ад уваходу, за столікам, які амаль хавала ў сваіх шырокіх галінах-пальцах штучная пальма. І Мерыям ўбачыла яго адразу, але неяк няёмка ўсміхнулася і адразу, нібыта ў чым правінілася, адвяла вочы. Ад яе зыходзіў непаўторны пах, духі, якімі яна карысталася, тыя ж, і водар той, які ён памятаў з Беларусі. І аднaчасова — нейкі новы. Штосьці змянілася, штосьці новае было ў гэтай жанчыне. Што?!

— Прывітанне! — Ігар хваляваўся, крыху разгублена ўсміхнуўся, нялоўка адцягнуў крэсла, павесіў на спінку плашч, сеў насупраць.

— Прывітанне... — Мерыям уважліва сачыла за кожным яго рухам. Косціч таксама ліхаманкава вывучаў яе: крыху папраўілася ў твары, стала больш жаноцкай, але ж чамусьці вельмі бледная. А ў вачах — нейкі стоены смутак, і, ад яго не схаваеш, нават спалох. Не трэба быць вялікім псіхолагам — жанчына моцна нервавалася.

Спытаў па-нямецку:

— Ты кепска сябе адчуваеш?

Мерыям суха, без эмоцый адказала:

— Не, усё добра.

— Але ты была ў бальніцы...



Раптам успомніў, яна нагадвала пра бальніцу, але раніцай не звярнуў асаблівай увагі на яе словы. Бледнасць — сляды хваробы. Ад чаго ж яшчэ?

— Сама гаварыла. Памятаеш?

— Праўда, усё ў парадку. У мяне... сяброўка ў бальніцы, дзякаваць Богу, пайшла ўжо на папраўку.

Нягледзячы на тое, што яна адказала ўпэўнена, ён здагадаўся: хлусіць. Навошта хлусіць?

— Як наогул справы? Сын...

— У Петэра і Гюнтэра — аллес орднунг! — адказала яна з хітраватай усмешкай, чамусьці напалову па-руску. — А ты вось, як вось тут апынуўся?

Яна закурыла, зацікаўлена і, знешне, здавалася, спакойна, паглядала на яго, пускаючы кольцы дыму. Ён таксама пацягнуўся за цыгарэткай, паціху прыводзячы свае думкі да ладу, глыбока зацягнуўся.

Праз хвіліну прамовіў:

— Ты ведаеш, мне здаецца, я надта доўга цябе чакаў. Я марыў цябе пабачыць.

— Гэта, мабыць, было вельмі складана зрабіць — у вас невялікія зарплаты...

Ад яе зыходзіў незразумелы халадок, але Ігар не звяртаў, не хацеў звяртаць на гэта ўвагі.

— Зусім і няцяжка. Турыст ён і ёсць турыст, а далей справа тэхнікі.

— Калі ты вяртаешся?

— Праз некалькі дзён. Вылет з Цюрыха. Праз Вену.

— Цябе адпусцілі... Не нажывеш праблем?

Здзіўлены позірк, зноў халодны.

— Я ж сказаў, справа тэхнікі, гід ведае. Я яму тэлефанаваў...

Ігар злосна патапіў у карычневай глыбокай цыгарэтніцы попел цыгарэты і, не адводзячы ад Мерыям вачэй, усхвалявана спытаў:

— Ты мне не радая?

Яна апусціла вочы, маўчала. Ігар нервова курыў, абдумваў сітуацыю. Яна сапраўды змянілася за гэтыя месяцы, стала нейкай інакшай. Але на чым і як адбіліся гэтыя змены найбольш? Ён пакуль не ведаў, ды і не мог зразумець. Нарэшце, яна зірнула на яго.

— Хочаш праўду? — суха спытала яна.

— Навошта ж мне няпраўда... — усміхнуўся Ігар і насцярожыўся, уважліва глядзеў Мерыям у вочы. Як яму хацелася яе пацалаваць!

— Ты дарэмна сюды прыехаў.

— Не зразумеў. Паўтары...

Мерыям пагглядзела ў яго блакітныя вочы, ледзьве стрымліваючы слёзы. Паўтарыла суха, адрывіста:

— Ты не жаданы тут госць.

Ён зноў закурыў і маўчаў. Рукі здрадліва дрыжалі. Нарэшце, спытаў:

— Чаму? Патлумач. Я ж...

— Не будзем кранаць пачуццяў, добра?

— А чаму і не, скажы? Болей жа нічога пакуль не патрабуецца. Пакуль...

— Ты так нічога не зразумеў, ці прыкідваешся?

Ён нервова ўсміхнуўся ў адказ.

— Дапускаем, мне — незразумела. Растлумач.

— Я яшчэ ў Мінску сказала, запамятаў? Тое, што павінна была сказаць. І адказала на той званок. Ты не дурань, і не прыкідвайся, Ігар. Ты разумны чалавек, каб не разумець...

Яе рукі зноў нервова задрыжалі.

— А што было між намі — цяпер няважна, так?

У Ігара мільганула думка: «Якая ж ты прыгожая, Божа!»

— Ігар, — спакойна пачала Мерыям. — Мы ўжо мінулі той узрост, не дзеці, каб жыць у нейкай рамантычнай казцы. Так, не стану ўтойваць: ты мне спадабаўся. Я табе. Ты захапіўся мной. Хаця ж не гэта галоўнае...

— Што ж ты лічыш... галоўным?

— Я ўсё сваё жыццё марыла наведаць Расію, вучыла ва ўніверсітэце расійскую мову, вывучала гісторыю гэтай краіны.



Я завочна палюбіла ўсё, што ёсць славянскае. Хаця ж да гэтай паездкі нават не ўяўляла, дзе знаходзіцца твая Беларусь. Але ж так атрымалася... Частка гэтай любові, ідэалізаванай, да славянства, я перанесла на цябе, таму што мне вельмі спадабалася гэтая паездка. Я проста ажыла, як прафесіянал. І ты ж, дарэчы, прафесіянал, прафесіянал высокага класа. Нас... пацягнула адно да аднаго спачатку толькі дзякуючы гэтаму. Прынамсі, мяне. Толькі ж я цудоўна ўсведамляла ўсё, што адбылося паміж намі — не больш чым збег акалічнасцяў, выдатны, так скажам, сумесна праведзены час... Ты заўсёды быў вольным. Ні перад кім няма абавязкаў. І — табе працей. А я... неўсвядомлена здрадзіла... Я — вялікая грэшніца...

Голас яе задрыжаў.

Ігар апусціў вочы — ён не хацеў даваць веры ніводнаму яе слову.

— Не буду хаваць ад цябе... Напэўна, мне сапраўды было патрэбнае такое... вар'яцтва пачуццяў. Але я ніколі не забывалася: у мяне ёсць сын, муж, сям'я, і я не магу і ніколі не змагла б ад гэтага адмовіцца. Гэта для мяне важней, чым... каханне. Вось і ўсё.

— Хочаш сказаць, што тады хацела і іншых глыбінь... Для глыбіні пазнанняў аб краіне... З абарыгенам... Хацела выдатна правесці час, выкарыстала момант і смазлівага хлопчыка? А цяпер — у кусты?!

Ігар сказаў з’едліва і пашкадаваў. Мерыям збялела, пачуўшы балючыя словы.

— Так ці не — якая ужо цяпер розніца? Кахаю я цябе альбо не — не пра гэта размова...

— Дык, значыць, усё ж такі кахаеш?

Ён уставіўся на яе і ўсміхнуўся, абязбройваючы сваёй незвычайнай усмешкай Мерыям.

— Ігар!

Мерыям спрабавала пратэставаць, але сілы яе пакідалі.

— Так, Мерыям, я слухаю цябе, каханая...

Ён не злаваўся напаказ, але сапраўдная бура паднімалася ўнутры яго.

Мерыям адчула гэта. Ёй цяжка было гаварыць. Прамовіла, ледзь знаходзячы рэшткі сіл, ціха:

— Прашу цябе, не рабі мне так балюча, чым было і ёсць. Ты вельмі добры чалавек. Я ведаю гэта... Ведаю... У мяне таксама ёсць сэрца. Не каменніца... Але ты... сапсуеш маё жыццё. З-за чаго? Ну, сустрэліся... Так сотні, тысячы людзей сустракаюцца. І добра. Трагедыі тут няма... Давай проста будзем успамінаць...

Ігар узарваўся.

— А як я? Сапраўднае каханне ты называеш забаўкай? Ты ж свайго мужа не кахаеш, не кахала і не будзеш кахаць ніколі! Гэта я выдатна зразумеў, калі ты так адгукнулася на маё каханне!..

Мерыям ледзьве стрымлівала слёзы.

— Супакойся, Ігар! Няхай гэта застанецца для кожнага з нас таямніцай. Прыгожай таямніцай. І будзем жыць кожны сваім жыццём. Мой лёс склаўся так, як склаўся, мяне ўсё задавальняе, і я не хачу, каб пакутавалі мае дзеці...

— Твае дзеці? — Ігар не мог ад здзіўлення прыйсці ў сябе. — У цябе ж толькі адзін сын?

Мерыям чамусьці разгубілася, але хутка авалодала сабой.

— Я, як бачыш, яшчэ маладая. Ці не знаходзіш? І ў нас з Гюнтэрам яшчэ будуць дзеці. У любым выпадку, я магу, як жанчына, гэтага хацець, ці не так? Альбо забароніш?

— Твая справа...

— Вось бачыш. У нас не магло і не можа быць працягу. Казка наблізілася да канца. Прабач мне, не ўсведамляючы, я пакінула, мабыць, табе нейкую надзею. Яе ж проста не магло быць. Гэта памылка. Ты павінен стварыць сваю сям'ю, у сябе дома. Выкінуць з галавы ўсё, што звязана са мной. У цябе цудоўная краіна, твая Беларусь. Я яе шчыра палюбіла. Так, жанчыне недаравальна такое казаць: але ж... ты страшэнна прыгожы, і любая за табою пабяжыць! Выйдзі, азірніся, пакліч! Прачніся, Ігар Косціч!

— Ты жорсткая...

— Наша жыццё жорсткае. Што ў нас, што ў вас. У нас таксама шмат, на першы погляд, нябачных праблем. Тысячы. У вас — свае.



Я спадзявалася, што ніколі больш цябе не пабачу, забуду, як сон. Прабач мяне, і, калі ласка, сёння ж едзь дадому. У горадзе у нас з Гюнтэрам шмат знаёмых, родзічаў. Не хачу плётак. Зразумей мяне, калі ласка. Калі пажадаеш, я правяду цябе да цягніка...

— А я хачу правесці з табой апошнюю ноч!

Ён прамовіў гэта ціха, але ўпэўнена. Яго блакітныя бяздонныя вочы пацямнелі, горача абпалілі яе, што жанчыну затрэсла ўсю знутры.

«Божа, як жа я хачу яго пацалаваць!»

— Прабач, я павінна ісці. Хутка вернецца са школы Петэр...

Схлусіла. Бязвінная хлусня...

Яна пачала збірацца, густыя светлыя валасы схавалі яе слёзы.

Косціч не паварушыўся, закурыў, глядзеў у адну кропку — на злоснага чорнага арангутанга. Спытаў раптам прыглушана:

— Ты сказала, што можаш мяне правесці? І тады мы... растанемся назаўсёды.

Мерыям застыла ў нерашучасці.

— Не ведаю, ці варта мучыць адно аднаго. Навошта табе гэта, Ігар?

— Мерыям, прашу цябе...

Яна не магла дазволіць сабе такой раскошы: зноў патануць у бездані яго вачэй, але ж нічога і не магла зрабіць са сваімі пачуццямі. Азірнуўшыся, спытала:

— Дык калі ты ад›язджаеш з Аарау?

— Заўтра... Раніцой.

— Ну што ж, магчыма... Сёння на набярэжнай, каля ракі. Насупраць ратушы. У шэсць. А калі не атрымаецца — прабач. І бывай, назаўсёды.

Яна хацела ўсміхнуцца, але ўсмешка атрымалася штучнай, нацягнутай, і нават, што ўзрушыла Ігара найбольш, абыякавай.

І пайшла — высокая, прыгожая, недасяжная.

А чорны арангутанг, як злосны рок, здавалася, пасмейваўся са знямелага адзінокага мужчыны, які на вачах раптам асунуўся

з твару, пачарнеў. Шустры турак-афіцыянт, як цяпер падалося Ігару, апрануты да агіднасці ва ўсё белае, раптам апынуўся побач. Спустошаны Косціч замовіў келіх віна...

Вечарам ён дарэмна яе чакаў ля ракі…

4

…За ілюмінатарам не было нічога цікавага — белыя воблакі, якія нагадвалі вялізнае заснежанае поле. Дзеля душэўнай раўнавагі і спакою Ігар адганяў ад сябе прэч усё, што адбылося ў маленькім швейцарскім гарадку; здавалася, ён бясклапотна бавіў час з масквічкай, якая не адставала ад яго яшчэ з моманту прылёту з венскага міжнароднага аэрапорту. На душы застаўся цяжар, а ад іх гутаркі лягчэй не станавілася. Урэшце рэшт масквічка Косцічу надакучыла, і ён прыкінуўся, што заснуў. І, застаўшыся са сваімі думкамі сам насам, як быццам раздзяліўся напалам.

Адна яго палова, палова зусім чужога яму чалавека, здзекавалася з яго, спрачалася з ім. Калі прыгадаць, то што такога адбылося? Чаго ён хацеў? Каханне?! Дзівак-рамантык. Неразумны чалавек, вось хто ты, Ігар Косціч! Нават плашч ад свайго гора пакінуў недзе на беразе Аарэ, дзівак! Дурань безгаловы. Давялося ў Цюрыху купіць вятроўку... Ды зірні, расплюшчы, урэшце, вочы, ёлупень! Калі засвярбела — вось тут іх, у самалёце, трыццаць галубак, што тыя анёлы, ды любая ў ложак ускочыць, толькі свісні. А ты — каханне... Труляля! Якое там чорту лысага каханне! Прачніся, хлюпік інтэлігентны!

Другая частка Косціча не пагаджалася з ім, падрымлівала мужчынскі пачатак: ты ж сапраўды кахаеш яе, як ніколі і нікога! Вось ў чым загвоздка. Гэта — самае важнае. Хто ж дасць веры, але ці трэба трубіць на ўвесь свет, што ў дваццаць дзевяць ты ўпершыню спазнаў жанчыну? Бярог сябе для сапраўднага, шчырага кахання. І тая аказалася — дзеля смеху ці што? — іншаземкай! Сваіх мала было?.. А зараз — як па-жывому выдраць з сябе ўсё тое шчымліва-светлае, што аберагаў у сваёй душы некалькі месяцаў?



Не, ён зможа, ён павінен выдраць з сябе любую дробязь, любую згадку пра яе.

Так, яна мудрэйшая, дакладныя словы сказала. Забава... Яны ж маладыя. Было і было. Навошта патрабаваць цяпер неверагодных звышпачуццяў. Ён, Косціч, хоць і злаваўся, але ў нечым павінен быць удзячны Мерыям: яна разбудзіла ў ім мужчыну, па-сапраўднаму разбудзіла. Дзівак, ён жа да яе сябе не ведаў. Хоць пасля іх неверагодных начэй нікога так і не знайшоў, не шукаў, жыў успамінамі аб Мерыям. А што ж перашкаджала жыць так, як іншыя? Што? Яго ж каханая ўвесь гэты час і не згадвала пра яго, жыла сваім, нібыта нічога не здарылася, жыццём, клалася спаць і засынала ў абдымках нелюбімага мужа, і нават, як прагаварылася, збіралася завесці другое дзіця. Нармальным жыве жыццём і не лунае ў мроях!

Праваліўшыся ў трывожны сон, Ігар, здалося, пачуў голас маці: «Сыночак мой адзіны, радасць мая! Адзіны ты ў мяне, адзіная радасць. Сама сіратой расла, адна, як каліва ў полі... Можа ўжо возьмешся за розум, хлопча, падорыш мне ўнукаў?! Ужо і пенсіі дажыла, а ўнукаў ніяк не пагушкаю. Як праклятая я...» — «Твая праўда, мама! Ты як заўсёды бачыш наскрозь. Штосьці трэба рабіць, бязглузды рамантык! Калі не сябе, маці пашкадуй. Адна яна ў цябе на белым свеце, а ўсё дзеля цябе зрабіла, бяздумны! Немаладая ўжо, кволая мама стала...»

...Цёмнавалосая, усмешлівая сцюардэса-аўстрыйка прапаноўвала каву і шакалад. Ігар адчуў смагу. Кава павінна была вярнуць яго да жыцця, а праз гадзіну — мінскі аэрапорт. Масквічка-студэнтка зноў узялася за сваё:

— Палову жыцця, лічы, Ігар, страцілі дарэмна. Што гэта вас прымусіла знікнуць за дзень да паездкі ў Люцэрн. Калі і ёсць рай на зямлі, то ён толькі там...

Ён удзячна ўсміхнуўся дзяўчыне.

—Затое ў мяне такі цудоўны інфарматар, як вы, Маша. Расказваеце так прыгожа, што і мне здаецца, нібыта там пабываў з вамі...

— Ну што вы так, Ігар? Я ж — ад душы. Думала: ці не здарылася з чалавекам чаго?

Косціч не чакаў таго, што зрабіў у наступную хвіліну: нечакана для сябе нахіліўся і смачна пацалаваў сімпатычнае дзяўчо. Дзяўчына абмякла на руках...

Вечарам масквічка не паехала да мінскай сяброўкі, у якой заўсёды спынялася. Яна засталася з ім. Да раніцы. Усё адбылося раптоўна, але як па некім заказанай праграме. Ігар зняў нумар у «Свіслачы». Беларускае шампанскае, швейцарскі шакалад. Усё было б проста выдатна, калі б у адзін з момантаў кахання мужчына не прастагнаў: «Мерыям, каханая...»

Маша да апоўначы хавала слёзы ў падушцы.

Раніцай адбылося тое, што і павінна было быць. Без шкадавання і згрызнот сумлення кожны з»ехаў у свой бок. Машка — усё ж з надзеяй на працяг. Прасіла пазваніць...

А ён, дваццацідзевяцігадовы мужчына, нарэшце, зразумеў: вось менавіта пра *гэта* і вяла размову яго першая жанчына! Праўда была на яе баку! Цяпер, ён прызнаўся сабе, усё адбылося зусім не так, як было некалькі месяцаў таму з Мерыям. Вось толькі хто б растлумачыў Косцічу: чаму так жудасна і брыдка на душы?..

Дома стаяла вясна. У сельскім гарадку паміж Мазыром і Туравам, у Міткавічах, дзе Косціч нарадзіўся і вырас, стаяў сапраўдны чаромхавы бум. У Ігара з-за гэтага зусім знік сон. Чаромхавы пах ён страшна ўзненавідзеў і пяшчотна любіў. Адначасова.

Трэба было пачынаць жыццё спачатку, але ён пакуль не ведаў, як гэта зрабіць.

Яго драму перажываў яшчэ адзін чалавек. У гэтыя дні маці, Яніна Іванаўна, малілася за сына...

5

Той нечаканы ранішні званок для Мерыям як гром з яснага неба...

Здавалася б, нарэшце выкараскалася з выпрабаванняў, пасланых лёсам, жыццёвая каляіна выраўнівалася. Занадта шмат перажыта за



час запозненай вясны. І, калі б не падрымка Гюнтэра, напэўна, адна яна ніколі б не вытрымала і звар'яцела.

Дзіця нарадзілася сямімесячным і кволым. Мерыям ледзьве выжыла, незапланаваныя роды адбіліся на яе: змучаная, знерваваная, яна не хацела нікога бачыць. Нават дачку. За жыццё дзяўчынкі цяпер змагаліся ўрачы. А яна?

А ёй першыя дні было ўсё роўна: выжыве малая альбо не. Толькі праз некалькі дзён, пасля цяжкіх родаў, яна зразумела, што адбылося, і хацела накласці на сябе рукі. Але ж як будзе без яе — яе дзяўчынка? Душэўная раўнавага вярталася, калі жанчына асмелілася і пайшла да дачкі, жыццё якой залежала цяпер толькі ад урачоў. Нагледзелася на празрыстыя трубкі, нараўлася. Нехта шапнуў ёй, каб схадзіла ў царкву, а яна не ведала, у якую царкву пайсці, каб памаліцца за сваю дачушку: толькі б яна выжыла!

Дзіўна, але ранейшыя атэістычныя погляды сышлі некуды самі па сабе, як толькі надарылася нечаканая цяжарнасць. Спачатку яна спалохала, забрала спакой. Нешта незразумелае адбывалася з ёй: спачатку ненавідзела яшчэ ненароджанае дзіця. А пасля песціла надзею, што гэта будзе дачушка. Нарэшце, супакоілася, разважыла: гэтае дзіця — падарунак лёсу.

Кар'ера рассыпалася на вачах. Было, зразумела, з-за чаго засмучацца: толькі нядаўна ёй аб'явілі аб павышэнні, цяпер Мерыям Хойслер магла заняць пасаду начальніка аддзела аграэкатурызму. Гадаваць дзіця і захаваць працу проста немагчыма. Надзей начальства яна не апраўдала, толькі што зробіш... Гюнтэр, насупраць, проста звар'яцеў ад шчасця і амаль што не насіў жонку на руках. Гэта выратавала яе ад лішніх думак і слёз!

Аддадзеная сама сабе, Мерыям цяпер думала, што, магчыма, варта было нарадзіць раней другое дзіця, каб зразумець, якія глыбокія пачуцці ў мужа, наколькі ён прывязаны да сям'і. Цяпер саракагадовы Хойслер раней звычайнага вяртаўся з працы, браў паперы дадому, дарыў ёй дарагія і надта шыкоўныя падарункі, часта называў жонку каханай. Мерыям нават не ведала, як рэагаваць на

такія нечаканыя прыемныя перамены ў Гюнтэра, пакуль, нарэшце, не зразумела, што Усявышні дараваў ёй, даў шчасце, сапраўднае, як самы яркі сонечны дзень.

Калі ж стала вядома, што яна носіць пад сэрцам дачку, жыццё Мерыям набыло ружовыя, вясёлкавыя адценні. Петэр не адыходзіў ад маці, стараючыся дагадзіць ёй і маленькай сястрычцы, што падрастала ў мамiным жывоціку.

Метамарфозы, на думку Мерыям, сталі раптоўна адбывацца з яе бацькамі. Ды і яна шкадавала і песціла старых цяпер як ніколі — ва ўзросце ж яны ў яе, не маладзенькія. А тата яшчэ ж гаруе на сваёй ферме! Яна часцей тэлефанавала і маці, не забывалася павіншаваць, калі надараваліся царкоўныя святы, і немаладую, а апошнія гады хваравітую жанчыну такая ўвага дачкі надта радавала. Маці прыязджала ўвотведкі амаль штомесячна, давала дачцэ парады, як правільна харчавацца і наогул па цяжарнасці: гэтыя парады збіралі ўсе яе сяброўкі-пратэстанткі.

Прабеглі незаўважна месяцы, і Мерыям здавалася, што паездка ў Беларусь — цудоўны сон, прыдуманы ёю, які ніколі не быў рэальнасцю. Ці магла яна нават падумаць, што рэальнасць нагадае пра сябе з зусім іншага боку?

«Добра, што ўсё здарылася менавіта так, як здарылася. Ігар зразумеў, што павінен быў зразумець, і з'ехаў. Назаўсёды. Няхай будзе так.»

... Учора Хойслеры прывезлі немаўля з клінікі дадому. Урачы канстатавалі: здаровае, цудоўнае дзіця, і яму месца цяпер побач з бацькамі. У доме лунаў святочны настрой.

Мерыям поўнасцю паправілася, аддалася хоць і бясконцым, але радасным мацярынскім клопатам, галубкай лётала вакол дачушкі. Калі дзіця заснула, жанчына спусцілася з другога паверха ў гасціную.

Гюнтэр чытаў газету і, час ад часу, калі што перадавалі цікавае, адкладваў яе ўбок і глядзеў тэлевізар. Мерыям згатавала чай, прынесла мужу і сабе. Прысела побач на шырокім скураным дыване. Гюнтэр звычайна любіў чай амаль халодны, у адрозненне ад Мерыям, якая мела звычку піць ледзь ці не кіпень.



— Дзякуй, каханая...

Рыжавалосы мужчына, узяўшы шклянку з чаем, цмокнуў жонку ў шчаку. Ён выдаваў надта стомленым, ад таго выглядаў зараз значна старэйшым за жонку, аднак усё ж маладзей сваіх гадоў, нягледзячы на акругленый жывот.

— Наша малышка заснула?

— Усё выдатна, мілы... — яна стомлена і шчаслiва ўздыхнула. — Ты таксама, бачу, не ў форме, стаміўся, а заўтра ж рана ўставаць...

Гюнтэр, не адрываючыся ад газеты, згадзіўся.

— Так, канешне. Вось толькі пагартаю, што тут нашы папарацы настараліся... Увесь тыдзень быў надта загружаны, не было часу хаця б пагартаць... Ты чула? Некалькі дзён таму у Аарэ вылавілі труп маладога мужчыны. Без слядоў гвалту на целе... Адна жанчына адпусціла з ланцужка сабачку, прагульвалася паўз раку, да самага лесу. Раптам пад вываратнем дуба сабачка зайшоўся брэхам. Калі жанчына дабралася туды, то ледзь не страціла прытомнасць: у карчах ляжаў тапелец. Жанчына заявіла ў паліцыю. Пішуць, нібыта яна некалькі дзён таму бачыла гэтага чалавека каля ракі. Прыгожы, малады, з чаго б накладваць на сябе рукі?..

Мерыям як не слухала мужа, маленькімі глыточкамі адпівала са шклянкі гарачы чай і ўважліва сачыла за тэлевізарам. Нарэшце, да яе дайшла інфармацыя, якую з сумам паведаміў муж.

— Тапелец? У Аарэ? — здзівілася яна, уставілася на мужа.

— Ага... Такія навіны для нашага гарадка — сенсацыя... Ведаеш, тут падрабязнае апісанне, — каментаваў Гюнтэр. — Пішуць, рост вышэй сярэдняга, прыстойна апрануты. Па пэўных звестках, у вадзе прабыў не больш двух-трох тыдняў. А на беразе ў лодцы раней быў знойдзены зусім новы мужчынскі плашч светла-бэжавага колеру. Фірма-вытворца невядома... Паліцыя звяртаецца да жыхароў горада з просьбай паведаміць, калі ў некага нечакана зніклі родзічы альбо знаёмыя мужчынскага полу трыццаці-трыццаці пяці гадоў...

Шклянка вывалілася з рук жанчыны, кіпень бязлітасна апёк ногі. Мерыям не змагла стрымаць боль, вусціішна закрычала, спалохаўшы мужа, які кінуўся ёй на дапамогу.

Яна плакала, уткнуўшыся галавой яму ў грудзі, так горка і натужліва, як ніколі за сваё жыццё. Устрывожаны Гюнтэр, калі б толькі мог, то жадаў бы ў той момант забраць жончын боль сабе, каб толькі не бачыць яе слёз. Ён збялеў, разгублена суцяшаў жонку: няўжо нязначны фізічны апёк мог выклікаць такі боль?

## Частка другая

### 1

Ён пахаладзеў ад сваёй згадкі. Здалося, спыніўся час.

— Вы хочаце сказаць, ваша дачка... — рыжавалосы Гюнтэр разгублена лыпаў вачыма і, нарэшце, зразумеў: ён сам ведаў адказ на сваё ж пытанне.

У голасе жанчыны прагучаў глыбокі і шчыры смутак. Аднак у зяця складвалася ўражанне, што цешча зусім не шкадавала дачкі. Даніэла шкадавала сябе. Больш, чым дачку.

— Я ведала, што гэта павінна было здарыцца. Бог вёў... — холадна прадоўжыла яна.

— Заткніся ты са сваім Богам! — страціўшы цярпенне, раз'юшана закрычаў Людзвіг. Ён стаяў ля акна, разгублены, жончыны словы ўшчэнт знішчылі яго. — А можа, ты лічыла, адмовіцца мне ад свайго адзінага дзіцяці? Ты і так усё жыццё грызеш мяне жыўцом. За што толькі. Каб хто спытаўся? Адгарадзілася, пабудавала нібы крапасны вал, а цяпер...

— Розум цябе... пакінуў!.. — Даніэла ледзьве авалодала сабой. — Я — добрая маці! Я любіла і люблю сваё дзіця!

Прагучала злосна і жорстка.

— Вось табе на! Не, даражэнькая, ты — кепская маці! Скажы, калі гэта не так, прызнайся свайму зяцю!

У Людзвіга сціснулася сэрца ад жалю да хворай, кволай жонкі, але стрываць, як Даніэла прыняла навіну пра дачку і ўсё, што з ёй здарылася, ён не мог.

У свядомасці Гюнтэра адбілася, як было нялёгка зараз цесцю раскрываць таямніцы іх сямейнага жыцця ў прысутнасці зяця.



Бачыў, як хвілін пяць таму ў цёшчы гнеўна выгнуліся бровы — ад злосці не магла сказаць і слова, і дзівіўся цяперашняму яе спакою.

Даніэла цяжка ўздыхнула, нібы збіралася ў падарожжа, далёкае і доўгае, і тут прысела толькі на хвілінку.

— Інакшага ад цябе я і не магла чакаць, мой мілы... — устаючы, прамовіла яна ціха.

Пераборка, зразумела, не прынесла ёй задавальнення, і яна вырашыла спыніць яе напаўслове. Цяжка дыхаючы, не зірнуўшы нават на мужа, накіравалася да дзвярэй на кухню.

Так звычайна завяршаліся ў гэтай сям'і спрэчкі. Зяць быў іх рэдкім сведкам, і ў іншай сітуацыі тое, што адбылося ў яго прысутнасці, яго б здзівіла. Аднак цяпер ён адчуваў сябе прыгнечаным. І крыху вінаватым у гэтай сварцы.

Людзвіг, нарэшце, зразумеў, што перастараўся, вінавата паглядзеў услед жонкі.

— Дані, я не хацеў, даруй...

Даніэла азірнулася. У яе голасе чуўся адчай.

— Я вельмі старая, каб нешта паправіць. І ты, стары дурань, гэтага ніяк не зразумееш...

Худая і зграбная, упэўненая ў сабе, не жадаючы паказаць мужчынам сваёй слабасці, а прыступы ўдушша не давалі ёй спакою усё часцей і часцей, жанчына рашуча выйшла з пакоя, рэзка зачыніла за сабою дзверы.

Заінтрыгаваны Гюнтэр доўга глядзеў на дзверы, за якімі схавалася жанчына, у якой ён, колькі быў жанаты, зрэдзь знаходзіў падобныя рысы з жалезнай ледзі старога англійскага кабінета.

— Я ўсё што заўгодна мог падумаць, толькі... — прамовіў ён разгублена.

Не пазбаўлены ў свае немаладыя гады прывабнасці, а сівізна толькі падкрэслівала мужнасць і сталую прыгожосць, Людзвіг, сядаючы за стол насупраць зяця, рашуча адсунуў шклянку, і сок ледзь не праліўся праз край. Здзівіўшыся свайму ўчынку, мужчына шырока расплюшчыў вочы і з непрыхаваным болем паглядзеў на зяця. У адчаі, нарэшце, прамовіў:

— Не думаў, што яна... здолее. Лічыў, забыта, замацавана пячаткамі памяці, ніхто пра тое не даведаецца і праўда сыдзе з намі на той свет. Не вытрымала, усё жыццё мне пакрамсала... — хрыплым голасам прызнаўся ён.

У глыбока асаджаных вачах немаладога чалавека застылі слёзы. Яго позірк быў разгубленым. Ён уставіўся на рукі, якія сціснуліся ў калакі. У Гюнтэра ад спачування старому сціснулася сэрца.

— Што адбылося — не вернеш... — усё, што ён мог сказаць у такой сітуацыі.

— У кожнага чалавека ёсць мінулае, і гэтае мінулае рана ці позна яго даганяе. Знойдзе, дзе б ты не зашыўся, схаваўся... — Людзвіг цяжка ўздыхнуў, стараючыся супакоіцца. Праз імгненне з болем у голасе спытаў:

— Што ты цяпер будзеш рабіць?

Гюнтэр прамовіў не адразу, затым пахмурна кіўнуў:

— Не ведаю.

— Вып'еш? — прапанаваў цесць.

— Дзякуй, не. Мне яшчэ вяртацца ў Цюрых, потым... дадому.

Кожны цяпер думаў пра сваё, доўга маўчалі.

— Сад у гэтым годзе хораша цвіў? — вырашыў перавесці гаворку на іншае Гюнтэр, дапіўшы, нарэшце, са шклянкі яблычны сок.

Стары фермер ведаў, што зяця ў цяперашніх абставінах якраз найменш цікавіў стан спраў на ферме, але з радасцю падтрымаў прапанаваны напрамак у размове.

— Ведаеш, зусім як нявесты дрэвы былі сёлета. Люблю гэты час, быццам занава нараджаешся... Хоць і позна вясна прыйшла, а ягада завязалася добрая. Хаця ж... навошта мне ўсё гэта, старому? Па цяперашнім часе вялікай выгады не чакай. Нашаму ураду, так атрымліваецца, цяпер прасцей нямецкага фермера падтрымаць, чым сваіх землеўладальнікаў. Еўропа на пяткі наступае, браце. За бясцэнак, лічы, лікёр свой аддаў. А які ж лікёр атрымаўся, братка ты мой! Цуд дый толькі... А былі ж часы! Працаваў і працаваць хацелася. Цяпер толькі клопат застаўся, звычка. А сілы не тыя, што праўда. Маладыя



ж не жадаюць працаваць на зямлі, няма выгады, ім высокія тэхналогіі падавай... Швейцарыя ж багатай не заўсёды была, і галоту давялося перажыць. Нашы дзяды працавалі не пакладаючы рук, дзякуючы ім выжыла краіна ў цяжкія часы: на працы, такіх, як я. Забыліся на гэта. Шкада, крыўдна. Усё ж яшчэ вернецца, чужым кавалкам падавімся. Толькі б не было позна... Знаеш, надумаўся ўсё ж прадаць частку зямлі...

Цесць расчаравана махнуў рукой. Хвіліны з дзве маўчалі.

— Дзякую за ўсё, Людзвіг... — Гюнтэр вырашыў ехаць, устаў.

— Ты спусціся ў склеп, для бацькі скрынку з вінам вазьмі там, я падрыхтаваў. Ён любіць маю вішнёўку... І сабе — калі хочаш... — прапанаваў ён зяцю.

— Дзякуй. Бацьку перадам. Абавязкова. Ну, мне час... — Гюнтэр марудна пайшоў да дзвярэй.

Здавалася, у гэты момант Людзвіг пастарэў гадоў на дваццаць, ён не чакаў, што прыйдзецца некалі весці такую размову з зяцем. Цяжка выдыхнуў:

— Гюнтэр, паслухай... Я цябе заўсёды паважаў. Ты прыстойны чалавек. Шмат што пераняў ад свайго бацькі, майго сябрука. Я ведаю Хойслераў вельмі даўно. І... прыму любое тваё рашэнне. Калі захочаш змяніць сваё жыццё, пазбавіцца ад... — Людзвіг у гэты момант быў варты жалю, апусціў вочы.

Гюнтэр адчуў сябе кепска: навошта ён наогул сюды прыехаў? Спапяліць сэрцы гэтых двух старых? Не, свае праблемы, як мужчына, ён павінен быў вырашаць сам. А старыя ў такой сітуацыі — не суддзі і не дарадцы! Дурань! Ідыёт!

— Карацей, у цябе, зразумела, ёсць прычыны вырашыць справу так, як лічыш патрэбным. Дастаткова, прызнаю, прычын... Але ж, сынок, я хацеў бы, каб гэты твой учынак быў па-сапраўднаму мужчынскім...

Стары абапёрся рукамі аб калені, устаў і, гледзячы Гюнтэру ў вочы, сказаў:

— Адно толькі прашу. Калі канчаткова прымеш рашэнне, пастарайся зрабіць гэта па-мажлівасці не так балюча для сваёй

сям'і, для маёй дачкі, для маіх унукаў. Скрушыць заўсёды прасцей, чым што-небудзь пабудаваць...

— Я ведаю, але гэта залежыць ўжо не столькі ад мяне... — Гюнтэр хацеў штосьці яшчэ сказаць, аднак не паспеў. За сцяной на імгненне пачуўся незразумелы шум, нешта ўпала.

— Даніэла, што там здарылася? — схамянуўся Людзвіг.

Жонка чамусьці не адказала, хаця мужчыны ведалі, што яна ўвесь час была за сцяной, побач, корпалася на верандзе.

Адчуўшы, што там адбылося нешта няладнае, цесць і зяць кінуліся праз кухню на веранду...

З паветрам адбывалася нешта незразумелае, дыханне перахапіла абодвум: у цэнтры прасторнай веранды, на кафельнай падлозе яны пабачылі маленькую гаспадыню старога фермерскага дома. Побач з ёй ляжаў перавернуты самаробны стул, на які яна звычайна станавілася, каб вышэй павесіць толькі што вымытую бялізну. У руках жанчына трымала махровы ручнік.

Мужчыны адначасова схіліліся над жанчынай. Краёчкі губ яе ўсміхаліся, а вочы глядзелі некуды ўверх. Здавалася, яна была шчаслівая. Даніэла не дыхала...

## 2

Сваё гора Мерыям хавала ад усіх. Усе апошнія ночы яна бесперапынна ціха плакала ў пакойчыку сваёй дачушкі, якая спакойна спала ў прыгожым, акаймаваным ажурнай разьбой, маленькім ложку.

Кожную раніцу яна спадзявалася знайсці сілы, каб паехаць у паліцэйскі ўчастак, прызнацца: ніхто іншы, а толькі яна вінавата ў страшнай Ігаравай смерці. Няма ёй даравання і не будзе ніколі! І — не ехала. Баязліўка.

...У думках Мерыям развіталася з ім даўно. Пасля Мінска дала сабе слова: ніколі больш не набліжацца да той рысы, за якой чакала небяспека згубіць сям'ю, павагу, любоў сваёй радні. Не, яна ніяк не зможа прамяняць ўсё гэта на каханне. Таму нічога і не трэба



змяняць. Ні за што! Але ж... Што рабіць з ім, гэтым дураватым каханнем? Толькі ж пабачыла яго, напоўненыя страсцю, малочна-блакітныя вочы, — вярнулася ўсё...

Не, не ўсё. Усё было ўжо іншым. І яна стала іншай, зусім другой Мерыям Хойслер, чым да паездкі ў Беларусь, той паездкі, якая падарыла ёй радасць і пакуты. Знікалі месяцы, а пасля галоўным стала другое. Самай дарагой стала навіна: жыццё маленькага чырвоненькага камочка, які адзін, здавалася, і здольны злекаваць збалелую яе душу, па-за небяспекай. Яе дзяўчынка хутка набірае вагу, будзе жыць! Дачушка яе, яе крывіначка, яе Анэта. Яе...

...Перажывала, што яе прызнанне ў паліцыі народзіць чараду чутак і нават плётак: хто ж у іх гарадку не ведае будаўнічага бізнесмена Гюнтэра Хойслера? Цяпер — тым болей цяпер! — не хацела разладу ў сям'і. І праклінала сваю нясмеласць: трэба было ж прымусіць сябе, чортава баязліўка, прайсці трыццаць крокаў... Толькі трыццаць крокаў — яна ж пайшла вечарам з ім на сустрэчу, але, спалохаўшыся, стаілася пад мостам, а пасля вярнулася дадому...

Страх і боль не пакідалі жанчыну ні на хвіліну. Яна ўжо нічога не магла зразумець... «Такі ж разумны, правільна ўсё зразумеў, здавалася, усё ўдакладнілі — кожны павінен жыць сваім жыццём. Так, была гэтая... выпадковая сустрэча. Здараецца. А выйшла насамрэч... Хлапчук! Што ж ты, дурань, нарабіў? Навошта так сышоў — адпомсціў, жадаў ёй кепскага?!»

Мерыям безупынна дакарала сябе: магло ж быць іначай, калі б захацела. Цяпер Ігара, яе каханага, адзінага ў свеце мужчыну, якога сапраўды кахала, забрала халодная Аарэ...

Збалелася яе душа: а як жа там, у Беларусі? У Ігара ёсць маці. Яна чакае сына дадому. Ігар жа неяк заўважыў, што маці дзеля яго можа ўсё аддаць... Што яна адчувае зараз? Не, ёй, Мерыям, неабходна ісці ў паліцыю!

Учора ў «AZAarau» надрукавалі інтэрв'ю з фотаздымкам нейкай мілавіднай мадам Хінтэррэдэр, якая сапраўды некалькі тыдняў таму бачыла ля ракі прыемнага маладога чалавека. Нябожчыка

інтэрв'ерша не апазнала, але вось плашч, пакінуты тапельцам у адной з лодак на беразе Аарэ, запомніла надта добра. З целам, паведамлялася ў іншым выданні, улічваючы адсутнасць інфармацыі аб нябожчыку, які, хутчэй за ўсё, па ўласнай волі звёў рахункі з жыццём, зробяць як і належыць у такіх выпадках...

«Што ж, даруй, даруй мне, Ігар... Нават цяпер я нічога не магу зрабіць для цябе! І для тваёй мамы...»

Таямніца адбірала ў яе дыханне, Мерыям, хаваючы ад мужа і сына слёзы і свой дурны настрой, імкнулася радзей трапляць ім на вочы. Штосьці гатавала на кухні, штосьці гаварыла ім услед...

Хутка слёзы зніклі. А бяссонныя ночы не маглі не адбіцца не толькі на настроі, але і на самаадчуванні. Жанчыне аднойчы падалося: яна загінула ў снежнай лавіне, і на яе жыцці некім пастаўлена тлустая кропка. Тлустая!!!

Нечакана, у рэдкіх гадзінах сну, сустрэлася з ім: усмешлівы, шчаслівы Ігар бяжыць ёй насустрач, а ў руках галінкі чаромхі — чароўны, дурманлівы пах... Згадала, што аднойчы сніла ўжо яго ды забылася.

Прыгожы і страшны сон, нібы насланнё, пераследаваў яе цяпер кожную ноч, нават баялася заплюшчыць вочы…

«Дурніца!»

Як дараваць сябе за тую і сённяшнюю баязлівасць? Трэба хаця б зараз, узяўшы Анну, з'ездзіць у праваслаўны храм у Цюрых — на гэта хопіць у яе духу?! Ды і гэты ж неверагодны сон: закаханы, умешлівы, шчаслівы Ігар бяжыць ёй насустрач, а у руках — яе любімая чаромха. Ён хоча нешта ёй паведаміць?..

## 3

Што за дурное пачуццё — гэтае праклятае каханне!!!

Ліхаманка, якая авалодала ім, не давала жыць. Дастаткова было падумаць пра Мерыям, каб усё ўнутры яго ўзбунтавалася! Праклён нейкі на ім ці што — ён не мог забыцца пра яе! А павінен жа, павінен быў праклінаць той злапомны дзень, калі ўпершыню



ўбачыў, упусціў яе ў сваю душу! І што рабіць цяпер? Што? Як жыць далей?

Божа, яна прагнала яго, як сабачку. Непатрэбную істоту... Нават збіраецца завесці яшчэ адно дзіця з тым, каго не кахае...

Ён не ненавідзеў яе, ён яе шкадаваў, як маленькае, невідушчае кацяня. Але ці мог нешта змяніць?

Ігар думаў, што справіцца сам са сваім болем, забудзецца. Час — лечыць. Толькі нічога не выходзіла, што б ні рабіў.

Днём Косціч хапаўся за любую працу, абы мець занятак і не думаць пра яе, а як толькі заканчваўся рабочы дзень, вяртаўся ў інтэрнат — і ўсё пачыналася зноў: думаў пра яе, такую далёкую яго радасць. Свой боль глушыў цыгарэтным дымам. Не дапамагала. У адзіноце ўпершыню ў жыцці напіўся. Вынік быў яшчэ горшы: прачынаўся ў нейкім чадзе, злавіўшы сябе на думцы, што толькі што гутарыў з Мерыям. Цяпер ён баяўся начы, якая як у кіно пракручвала зноў і зноў усе дэталі іх сустрэч і такога сумнага растання. І навошта гэта ўсё на яго галаву?!

Як божы знак, раптам падала пра сябе вестку Машка: патэлефанавала і пацікавілася яго жыццём. Няўсвядомлена, але хапаючыся як тапелец за саломінку, Косціч абрадаваўся ёй. Выйшла так, а не іначай: раптам сам запрасіў дзяўчыну да сябе.

— У нас, Маш, тут такое... Усе запыханыя, як мурашы снуўдаюць. Хутка турыстаў, паломнікаў наедзе... Тысячагоддзе Тураўскай епархіі, юбілей Мазыра. У ў Тураве вялікія святы чакаюцца — у верасні...

— Тураў... — паўтарыла невядомую назву масквічка. — Штосьці старажытнае...

— Ага, пасля Кіева, у свой час, другі горад на Русі... Тураву вернуты статус горада, хоць і нагадвае вёску. Але ўсё ж — гісторыя славянства. Калі ёсць жаданне, чакаю... — вырвалася між іншым у Ігара.

— Ты мяне запрашаеш, Ігарок? — дзяўчына, адчувалася, шчыра ўзрадавалася, а прапанова спадабалася ёй. — Я абавязкова прыеду. Вось пабачыш...

Ігар, пачуўшы яе згоду, разгубіўся: вось дурань, ляпнуў на сваю галаву, каб пра нешта гаварыць, а яна... Але праз імгненне з›явілася другая думка: хопіць зводзіць сябе! Гэтае смазлівае дзяўчо — што тут перабіраць? — чым не варыянт для блізкіх зносін, здольных адрынуць з яго душы застарэлы боль. Хаця ж, гледзячы праўдзе ў вочы, мінскую гасцінічную ноч сексуальнага падзення з масквічкай Косціч даўно выкрасліў з памяці. Здавалася, назаўжды. Ды не, нешта зварухнулася ў душы. Няўжо ўсе мужчыны так успрымаюць жанчын, з якімі хоць аднойчы дзялілі ложак?

Зараз, калі столькі перагарэла ў душы, стала відавочным: няхай вядзе яго лёс куды захоча. Мерыям гэтага хацела, нават — прасіла...

— Ведаеш, з маёй дурной працай лепш сустракацца пасля святаў... — раптам вырвалася ў яго.

— Спалохаўся? — пачуўся вясёлы смех у трубцы, але дзяўчына была настойлівая. — Няўжо адмовішся ад запрашэння?

— Навошта ты так... Я буду вельмі рады... — выцягнуў з сябе ноткі ветлівасці.

— Я думаю, што ты не пашкадуеш! — загадкава праспявала ў трубцы Машка. — Бывай, мілы. Прывітанне...

— Бывай...

Пачуліся кароткія гудкі, а Ігар упершыню ўпершыню спакойна, лагодна ўсміхнуўся і сказаў сам сабе: «Вось табе і замена, Мерыям… Магчыма, Машка і ёсць мой лёс? Хто ведае...»

Ён злавіў сябе на думцы, што яго адпусціла; лягчэй і лягчэй станавілася, калі думаў пра дзяўчыну, выпадковую спадарожніцу ў бязрадасным для яго пералёце некалькі месяцаў таму. Як магніт прыцягвае лёгкі метал, так і ён цяпер ікнуўся прыцягнуць у свае мары другога чалавека, адносіны з якім у першы раз пакінулі цяжкаватыя пачуцці на душы, але, нягледзячы на гэта,— бясклапотныя і светлыя.

На працы Косціч таксама выглядаў спакойным. Яшчэ нядаўна зусім не кранала канторская мышыная мітусня, пабудаваная на даносах і плётках. Вось дзе сюжэты для раманіста — няма чаго і галавы ламаць, — толькі спісвай. І плагіятам не назавеш. Праз



нейкі час бесталкоўшчына стала раздражняць Косціча. Складвалася ўражанне, што перамыванне «костачак» і ёсць асноўны клопат большасці яго калег. Ігар ледзь стрымліваўся, каб не ўчыніць бунт.

У канторы адсутнічала як лагічнасць, так і элементарная разумнасць таго, чым гэтыя людзі займаліся. Косціч раптам зразумеў важнасць аднаго пастулата: дык усе ж жывуць дзеля сябе? Усе — без выключэння — імітуюць занятасць, не прыносячы грамадству ніякай карысці. А зарплата, па беларускіх мерках, невялікая, але і не маленькая. Педагогам, напрыклад, і не снілася... Толькі якая аддача ад гэтых гора-спецыялістаў?

Ён губляўся ў роздуме: хоць тысячу разумнікаў будзе у камандзе прэзідэнта, да палітыкі якога Ігар адносіўся часта з крытычнага боку, але паважаў, пакуль людзі не будуць адказваць за канкрэтныя вынікі працы, — нічога не зменіцца. Разарвіся, а не будзе! Адных старанняў наверсе і спрыяльных законаў мала. У любым выпадку для іхняй, згубленай у глыбінцы, структуры, пакінутай без асаблівай увагі высокага кіраўніцтва. Ад таго і бардак у аддзелах. І справа не ў метадах кіраўніцтва, а ў каранёвай савецкай псіхалогіі людзей, адносінах да працы. Любіць трэба тое, чым займаешся, каб мець хоць нейкі вынік. І адаптавацца за сусветных змен: ліха б вас пабрала, дваццаць першае стагоддзе на дварэ!

Сляпец, як ён раней гэтага не бачыў?! Шэф, нястрымны, як і ягоная жонка, да лёгкай нажывы, некалі ж падаваў надзеі ў навуцы. А што цяпер? Як сапраўдны тэатрал рэжысіраваў бурную дзейнасць-спектакль, быццам па разнарадцы пакрыкваў на падначаленых, толькі нічога не прымаў з канкрэтных захадаў, каб што-небудзь прывесці да лагічнай разумнасці ў канторы. А ці мог ён — пытаўся цяпер пастаянна ў сябе Ігар — нешта змяніць да лепшага? Галоўнае: ці хацеў? Выходзіла: і не стараўся. Пра навуку забыўся зусім — неактуальна, бо яна даўно не корміць. Галаўным болем апошніх месяцаў было адно: збыць адрамантаваны пасля чарговых жончыных аварый «мэрсік». Спектакль дасягнуў свайго эпагею: нарэшце, дзейства куплі-продажу завяршылася. Таўстун

Пал Палыч лунаў у паднябессі ад радасці: збыў! З наварам! А калегі як шчыра яго віншавалі, нібы самі прэмію атрымалі.

Настрой Косціча з кожным днём пагаршаўся і па іншай прычыне: напярэдадні на яго навуковым абаснаванні па захаванню і абароне ад наступальнай дзейнасці чалавека на запаведныя верхавыя балоты шэф размашыста напісаў: «Тав. Косціч. Памылковыя, мала аргументаваныя вывады. Неперспектыўны накірунак для сённяшняга дня. Установа задыхаецца ад недафінансавання, трэба шукаць дадатковыя сродкі...»

Ігар пасварыўся з Пал Палычам, той абазваў яго сапляком. І тады малодшы навуковы супрацоўнік падняў гэтую тэму на навуковым савеце, дзе даказаў: не захаваўшы верхавыя балоты і прыродныя пойменныя дубровы, традыцыйны ўклад жыцця жывёльнага свету ў асобна ўзятых рэкрэацыях парка і асабліва ў запаведнай зоне збяднее, хутка вучоным не застанецца ў цэнтральнай частцы Палесся аніякай работы. А пакуль ёсць навуковыя работнікі, то павінна развівацца такая дзейнасць па ахове...

Даказаў, аказалася, самому сабе. Пасля памянёнага савета з ім баяліся нават загаварыць. Толькі адзін чалавек асмеліўся. Маўклівы Васіль Ігнатавіч, у курылцы, сказаў яму: «З'ядуць цябе, Ігар. Ей-Богу, з'ядуць. У мяне ёсць сябар ва ўніверсітэце. Кідай усё, едзь. Навукай табе трэба заняцца, а не тут на пасылках бегаць. Галаву светлую маеш, праб'ешся. Пакуль не позна і нічога не трымае ў асабістым плане. Пасля, можа, і нашу кантору паднімеш...»

Здзівіў, стары! Ды толькі зноў схаваўся, нават не заўважаў Косціча.

Начальства паказвала незадаволенасць, і Ігар разумеў прычыну. Хто дазволіў яму, маладому сваавольніку, падымаць непапулярную тэму? Актуальна сёння іншае — гаспадарчаразліковая дзейнасць, развіццё агратурызму, прыцягненне іншаземцаў на паляванне. Сядзі дзе сядзіш, ды не высоўвайся. Зарплату табе ж налічваюць. А навука? Каму яна патрэбна ў гэтым шалёным гоне за грашыма, якія самі плывуць у рукі?



«І навуку рухаць трэба. Усё павінна мець навуковую базу, прыроднай раўнавазе адпавядаць, абароне адзіных у старой Еўропе сапраўдных прыродных рэзервацый?» — спрачаўся ў думках Ігар, але выказаць іх не было каму. Акрамя падазронасці, нічога за апошнія дні не нажыў.

За кароткі час раптам усё змянілася. Рамантычная натура, нарэшце, зразумеў: з балота трэба было некуды выбірацца. Надакучыла да чорцікаў. І... ніяк не рашаўся на апошняе дзеянне, хаця заставацца ў канторы было немалым выпрабаваннем. Ён «выядаў» сябе знутры: «Што, малодшы навуковы супрацоўнік Косціч, і ты прыняў ўстаноўленыя Пал Палычам правілы гульні?..»

Днямі шэф загадаў Косцічу замест сваёй жонкі, якая раптам з'ехала на Нарач, працаваць з групай расіян. Ігар адмовіўся.

— Незадаволеных не трымаем... Заяву на стол — вольная птушка... — раз'юшаны Пал Палыч паказаў на дзверы.

— Час вас раздавіць, запомніце мае словы... — сумна адказаў Ігар і выйшаў.

Праз пяць хвілін Ігар Косціч застаўся без працы. Ён не ведаў, ці правільна зрабіў, але і заставацца тут больш не мог. Спакойна напісаў заяву на чарговы адпачынак. І другую — на звальненне. У аддзеле кадраў са спачуваннем аддалі працоўную кніжку: шчодрае сёння было начальства, нават не чакала завяршэння адпачынку...

Для маці звальненне сына стала сапраўдным шокам — тут, у палескай глушы, за працу ў такой салідная установе любы трымаўся б да апошняга. Ці зразумеюць яе сына ў маленькіх Міткавічах, дзе знайсці добрую працу — галаву скруціш?

...Мудрая жанчына, якая сорак гадоў працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры, аднак з паўслова зразумела сына: не склалася. З кім не здараецца. Бывае. Не прападзе яе Ігарок. Чырвоны дыплом нечага ж варты? Знойдзе працу. А яна — падтрымае. Няхай і даўно ўжо і пенсіянерка, але ж ў яго ёсць маці. Яна ж ад вайны расла адна. Без нічыёй дапамогі. Выжыла. Ці можа яна сумнявацца ў сыне, у якога закладвала ўсё лепшае, што, па яе перакананнях,

павінны быць у мужчыне? Тое, чаго не даў Бог яе былому мужу, Ігараву бацьку, які пакінуў яе з малым дзіцёнкам на руках, без кавалка хлеба, дзеля другой жанчыны? А потым, зразумеўшы сваю памылку, згарэў ад гарэлкі... Але так і не вярнуўся назад. А яна кахала. І прыняла б, што б там не казалі потым у школе. Ганарлівы быў, але так апусціўся чалавек. Зламаўся там, у іншым сваім жыцці. Такой долі ніякая маці свайму дзіцяці не пажадае. І цяпер яна перажывала за сына: у ягоных вачах было столькі намешана, што сэрца маці збалелася. Яна ведала: сын закахаўся. Ды — не клеіцца нешта. Бачачы, як ён перажывае, думала пра адно: толькі б не нарабіў ты, сынок, памылак у гэтым жыцці, якія выправіць цяжка...

— Значыць, гэта не тваё, Ігарок. Цяжка будзе, ведаю. Грошай у нас мала, мая пенсія, прырабатак мой за падрыхтоўку вучняў да здачы тэстаў у інстытут... Капейкі. Машыну на Швейцарыю, канешне, дарэмна абмяняў... Але не памром. Куды толькі табе падацца? Можа, у школу? Працуюць жа людзі. Чула, там цяпер філолагаў зашмат, а біёлагам можна ўладкавацца... Я магла б спытацца ў свайго дырэктара, усё ж не забыў на сваю калегу, нейкай жа і заслужанай настаўніцай лічуся... — прапанавала яна.

— Не хвалюйся так, мама. Табе з тваім сэрцам толькі пра гэта думаць? Я ўсё вырашу...

— Бог з табою. І добрыя людзі ёсць паўсюль.

Але спаць спакойна цяпер не магла. Прыходзіла ў галаву чамусьці толькі кепскае... Маці — самы вялікі вораг свайму дзіцяці.

4

Бацька... Маўклівы, бяздзейсны, для якога жыццё нібыта спынілася на магілкавым квадраціку. Маці ў маленькай урне, пропаведзь у пратэстанцкай царкве. Святар знайшоў такія цёплыя развітальныя словы пра сваю памочніцу — дагэтуль яны не сцерліся з памяці Мерыям. Ёй было балюча: чаму яна не ведала сваёй маці, а тая ж, так атрымліваецца, столькі добрага зрабіла для людзей?!



А яшчэ такі раптоўны холад, які сыходзіў ад мужа — гэта яна адчула ў час пахавання. І — зараз. Гюнтэр чамусьці аддаліўся ад яе, у яго вачах нешта змянілася. Куды ж знікла тая радасць, з якой ён сустрэў нараджэнне маленькай дачкі? Няўжо яна памылілася? Няўжо так і ёсць? Няўжо Гюнтэр таксама не кахаў яе? Хаця б для прыліку пашкадаваць мог...

А раптам у яго з'явілася іншая жанчына?

Яна гублялася ў дагадках, аднак адказу не знаходзіла. Вось ужо тры дні Гюнтэр наогул не прыязджаў, нават не тэлефанаваў. І яна не ведала, што думаць. Петэр быў няўмольны: штохвілінна пытаўся пра яго, сумаваў — хлопчык так падобны на бацьку. Мерыям набрала цюрыхскі нумар мужа, аднак сакратарка адказвала адно і тое ж: шэф заняты, ён абавязкова звяжацца з ёю пазней.

Але тэлефон маўчаў. Няўжо Гюнтэр абыякавы да яе гора? Не, штосьці здарылася. Сотавік не злучаў. І вечарам яна набрала нумар дамашняга тэлефона. Нарэшце, Гюнтэр узяў трубку.

— Табе цяжка пазваніць? Няўжо гэтак заняты? — у голасе Мерыям прагучаў дакор. Але насцярожылася, калі той нічога не адказаў. Нарэшце, яна не вытрымала:

— Што ў цябе там, чорт вазьмі, адбыв...

Гюнтэр абарваў яе з паўслова:

— А ты не здагадваешся? Святая грэшніца... Гэтае пытанне задай найперш сабе, а не мне!

Ён быў п'яны. Яе муж, вядомы бізнесмен, напіўся да чорцікаў.

— Гюнтэр, скажы праўду... — вочы Мерыям пацямнелі, устрывожаная яго словамі, яна ледзь не выпусціла з рук тэлефонную трубку.

— Здарылася даўно, — Гюнтэр закрычаў у трубцы дзіка, страшна. — Даўно здарылася, чуеш? Нявінная горная козачка аказалася далёка не нявіннай. А як жа іначай: ці можа дачка рускай прастытуткі парушыць мацярынскі наказ?! Яна абавязкова стане такой жа... прастытуткай. Яблык аб яблыні далёка не коціцца... Усё жыццё прытворнае, наплявала ў душу, на мае пачуцці! Я праклінаю цябе...

— Ты здурнеў, Гюнтэр! У цябе выражаная белая гарачка... — знямелая Мерыям нічога не магла зразумець. — Я прыеду зараз дадому.

— Дадому? Табе тут больш няма месца! I ніколі не будзе! Можа, ён ёсць у цябе ўжо ў Беларусі? Дык гэта мяне, ведаеш, ніяк не датычыцца, гэта — твая асабістая справа. Давай, звані ў аэрапорт, ляці! Ён, дарэчы, жывы, паскатушка, твой каханак. Я звяртаўся за даведкай — выляцеў своечасова, так што здаровы, як бык. А то ты, няшчасная, звялася... Бедненькая, утапіўся з-за кахання, палюбоўнічак... Як высакародна! Усе падушкі вымачыла. Жывёліна!!!

— Ты, ты... — Мерыям захліпалася ад слёз.

— Я ўсё ведаў з самага пачатку. Ты вярнулася другой, не швейцаркай, рускай... А потым прыйшло па электроннай пошце пацвярджэнне з Берліна, ад тваёй сяброўкі па падарожжу: што, няўжо ніяк не падзялілі смазлівага смаркача? Амаль жабрака-хлапчука, які... з радасцю зняў швейцарскіх дам? Я ж дараваў табе ўсё, прыняў тваю дачку, няўдзячная. Я ўсё дараваў! Навошта ж гэтаму быку было лезці напралом у мой дом? Каб зняважыць маё добрае імя? Я не верыў, пакуль на свае вочы не ўбачыў: пайшла на сустрэчу. Нашто ты гэтак са мной? Адказ да смеху просты: твае праклятыя гены, праявы якіх я заўсёды заўважаў. I расцэньваў не як адхіленне, а як звышдадзенасць. У мяне была такая непадобная на швейцарскіх жанчын жонка! Я не дарую сабе, што так позна даведаўся пра праклятую генеалогію тваёй сям›і!

— Выдумкі неўрастэніка! — Мерыям здавалася, што сілы яе вось-вось пакінуць, яна страціць прытомнасць, але нешта стрымлівала яе.

— Гэта — горкая праўда...

— Ты ўдарыўся галавой... — холадна адказала амаль змярцвелая жанчына.

— Што ж, дзякаваць Богу, гэтага не адбылося. Спытайся лепш свайго бацьку, пасля чаго здарыўся няшчасны выпадак з Даніэлай...



Я ненавіджу цябе: дазволіла гэтаму прыдурку прыперціся сюды, арганізавала сустрэчу ў рэстаране, бегала за ім, як апошняя сучка. У цябе не хапіла розуму ці хаця б сораму спыніцца, вырашыла пагуляць з маімі пачуццямі... Не выйшла. Мне не патрэбна ў маім доме дачка прастытуткі, жонка прастытутка, унучка і дзіця прастытуткі. Я забяру сына, а ты каціся на ўсе чатыры бакі. Мой адвакат ужо вядзе справу. Хаця ж ты можаш вярнуцца да мяне пры адной умове: калі адмовішся ад свайго... вырадка. Заплачу колькі трэба, каб ён вярнуўся туды, дзе быў зачаты. Выбар за табою — адваката знайсці ведаеш як. Другой магчымасці вярнуцца да ранейшага жыцця ў цябе няма.

— Гюнтэр, так нельга. Мы ж цывілізаваныя людзі...

Размова была скончана.

Мерыям не верыла, што гэта ўсё адбываецца з ёй! Катастрофа... Як абухам па галаве. Трэба супакоіцца. I раптам...

О, Божа! Яна адчула сябе неверагодна шчаслівай, згадаўшы самае важнае, пачутае ад Гюнтэра: яе Ігар жывы!

I ў той жа момант забітай горам: яе жыццё сышло пад адхон. Толькі што значыла яго страшная заява пра маці? Ці значыць гэта, што Даніэла, яе маці, дзесяцігоддзямі прыслужвала ў царкве, каб замаліць нейкі свой грэх... Няўжо яна руская? Кім яна была да сустрэчы з бацькам?

Нарэшце, крыху акрыяўшы, яна накіравалася да сына, адарвала яго ад камп'ютэра. Хітрун Петэр на просьбу пабыць ля Анэты зявіў катэгарычна:

— Добра, але заўтра адправіш мяне да бацькі. Мне тут сумна...

— Паглядзім. Гэта пакуль немагчыма, твой бацька вельмі заняты... — схлусіла Мерыям. — Сынок, калі сястрычка прачнецца, адразу пакліч мяне...

Мерыям накінула на плечы кофтачку і накіравалася ў сад, дзе ў вячэрняй прахалодзе абходзіў свае ўладанні Людзвіг. У дзённую спякоту выходзіць на поле яму забараніў урач, смерць жонкі падкасіла мужчыну. Дачка баялася непакоіць яго, але ў яе не было выбару.

Бацьку знайшла ў альтанцы на ўскрайку вішнёвага саду, супакоенага і ціхага. Убачыўшы дачку, ён ажывіўся.

— Унучка заснула?

— Ага, татка. Петэр наглядае...

Яна села насупраць бацькі, рукі склала на самаробным століку.

Людзвіг скупа ўсміхнуўся дачцэ:

— Мы так любілі сядзець тут з тваёй маці. Цэлае жыццё — перад вачыма. Так, цэлае жыццё.

— Нам будзе не хапаць яе, тата. Усім цяжка зараз, а табе ж асабліва. Толькі ты трымайся. Ты патрэбен мне. Петэру, Анэт, нашай Анначцы... Я не дарую сабе, калі, не дай Божа, з табой нешта здарыцца. Ты ж мудры чалавек, і павінен трымацца за жыццё...

— Дачушка, я ведаю, ведаю, як ты любіш мяне... Ведаю. Толькі ж... зараз ты прыйшла з іншым, важным для цябе. Ты хочаш ведаць праўду...

У куточках яго выцвілых вачэй, як у промнях апошняга сонца, заблішчалі слёзы, а рукі старога, але яшчэ дужага чалавека, не згубіўшага за гады сваёй прывабнасці, затрэсліся.

— Супакойся, тата... — Мерыям прыкрыла яго вялікія, пабітыя венамі, рукі сваімі, пагладзіла іх.

— Я ўсё ж спадзяюся, Гюнтэр вырашыў справу па-мужчынску, і вы пагаварылі без скандалу... — цяжка даліся словы бацьку.

Яна шырока расплюшчыла вочы і зразумела: бацька ведае ўсё! Божа, як яна магла менавіта ў такі складаны перыяд жыцця дадаць яму, самаму дарагому чалавеку на свеце, столькі перажыванняў?

— Даруй, тата...

— Кажы, дачка, як ёсць... — ён глядзеў ёй у вочы з разуменнем, адкрытасцю, нейкім унутраным жалем.

— Што ж, тата... Усё так няпроста... — пачала блытана Мерыям. — Я вымушана засмуціць цябе. Толькі не прымай блізка да сэрца, добра? Я вельмі кепская дачка, калі ў такія дні перакладаю на цябе і свае турботы. Толькі так складваюцца абставіны...



— Балюча мне не зробіш, чым ёсць. Ды толькі каму мая маленькая Мерыям можа паскардзіцца, калі яе нешта турбуе. Гавары... — расчулена прамовіў Людзвіг.

Божа, нават у такім стане ён знаходзіць сілы, каб падтрымаць яе, сваю дачку! Колькі ж душэйнай і фізічнай моцы ў гэтым чалавеку!..

— Гюнтэр, як ні балюча табе будзе слухаць, ніколі не быў маім абраннікам. А пасля сённяшняй размовы, якую і размовай цяжка назваць, не думаю, што яшчэ магчыма нешта наладзіць у нашых адносінах. Мамін разлік на гэты шлюб, на жаль, не спраўдзіўся. За выключэннем...

— Петэра. Анна — дачка другога мужчыны. — Людзвіг паглядзеў на дачку дабразычліва, без намёку на дакор.

Мерыям здалося, што яна вось-вось праваліцца пад зямлю, яе шчокі сталі пунсовымі, а на ілбе выступіў пот.

— Гюнтэр? — ціха ўдакладніла яна.

— У той самы вечар. Перад смерцю той жанчыны, якую ты лічыла сваёй маці амаль трыццаць гадоў.

— Што? — Мерыям войкнула. І ў тую ж самую хвіліну перад яе вачыма так ясна адбіўся вобраз незадаволенай Даніэлы, напамінак пра дурную кроў, адгаворы ад заняткаў па славянскай гісторыі і культуры, настойлівае жаданне прывіць рэлігійныя ўстоі, да якіх ніколі не было ў яе цягі.

— Тата, гэта — няпраўда!

— Паслухай, дачушка. Даніэла — табе не кроўная маці. Цябе нарадзіла іншая жанчына.

Мерыям на імгненне знямела. Толькі ўтомленыя пагаслыя вочы за яе гаварылі, што жанчына хацела ведаць усе падрабязнасці гэтага, падобнага на няпраўду, прызнання. Бачачы яе ўзбуджаны стан, Людзвіг, які хваляваўся не меней дачкі, прадоўжыў.

— Ты ж павінна разумець, што для нашага ўзросту ты — вельмі позняе дзіця. Даніэла ж проста не магла мець дзяцей. Калі гэта стала вядома, нічога нельга было змяніць. Яна раней халодна ставілася да рэлігіі, але, калі ўрачы аб'явілі несуцяшальны дыягназ, ледзь не

кранулася. Суседка, каб развеяць, запрасіла яе на царкоўны сход, і яна знайшла там суцяшэнне...

— Я — прыёмнае дзіця? Ты таксама мне не... — Мерыям, здавалася, вось-вось расплачацца.

— Не, супакойся. Я твой бацька. Так здарылася, што мы не маглі нейкі час жыць разам з Даніэлай. Яна кінула мяне, паехала да бацькоў. А я вярнуўся сюды, у наш родны кантон, стаў дапамагаць бацьку на ферме. Ну і... разумееш, я ўсё ж такі мужчына. У мяне доўгі час была сувязь з жанчынай... Ты ведаеш, як такіх завуць...

— Божа...

— Праз нейкі час Даніэла адумалася і вярнулася да мяне. Мы купілі побач з маімі бацькамі кавалак зямлі... Аднойчы да нас прыехалі з паліцыі. Так і так. Ірына, так звалі тваю сапраўдную маці, атруцілася ў бардэлі. Яна нарадзіла два гады таму дзяўчынку...

— Гэта кашмар... Тата, няўжо гэта праўда? — Мерыям заплакала.

— Так, дарагая, сумненняў не заставалася, што ты мая дачка. Я падлічыў: у яе не было ў той час мужчын, і я ўтрымліваў яе... Ды і Ірына, мабыць, спадзявалася на большае са мной, але, калі даведалася, што Даніэла вярнулася, не прызналася… і нарадзіла дзіця. Назло мне, ведаючы, што ў нас не будзе сваіх... Паміраючы, яна пакінула на стале мой адрас і прызнанне...

— Гэта неверагодна.

— Забраць цябе было складана. Даніэла — спачатку... Гэта трэба было перажыць... Пра родзічаў Ірыны нічога ў паліцыі невядома. Я ж толькі ведаю, што яе бацькі з Расіі. Эмігранты. Пераехалі пасля вайны з фашыстамі. Жылі недзе ў Аўстрыі, а потым з імі нешта здарылася. Памерлі. Ірына была вельмі прыгожай жанчынай, толькі жыццё было бязлітасным да яе...

— Мая маці — прастытутка... — праз сілу выдыхнула Мерыям.

— Твая маці была, нягледзячы ні на што, добрай жанчынай. Так, ёй без падтрымкі радні, без прафесіі цяжка было выжываць, і за такі занятак я яе не асуджаў. Думаю, нейкі час я нават кахаў яе. І ўдзячны



ёй за такі падарунак. Згубіўшы сэнс жыцця, яна, адыходзячы, падаравала мне, даверыла цябе мне, сапраўднаму твайму бацьку.

— Вось чаму Даніэла мяне не любіла! — усклікнула Мерыям.

— Яна любіла цябе, толькі па-свойму. Ты ж была ёй, зразумела, пастаянным напамінкам аб маёй здрадзе, але яна старалася быць табе маці. Сапраўднай маці. Ты не можаш гэтага адмовіць...

— Гэта так, тата. Толькі я ўсё роўна штосьці адчувала. Нешта было не так. А калі паступіла на славянскі факультэт...

— Для яе твой выбар стаў сапраўдным ударам. Яна так і не змагла, як ні старалася, змяніць твой лёс. Імкнулася, рвалася, ненавідзела ўсё, што было звязана з рускімі, са славянствам. Адно, што выйшла па-ейнаму плану — твой шлюб з Гюнтэрам Хойслерам. Я не мог супрацьстаяць яму, усё было даўно вырашана. Ды і сябрукамі сталі мы з яго бацькам, агульныя ў нас былі інтарэсы. Толькі і тут, яна зразумела гэта перад смерцю, нічога не атрымалася. Я ж ні слова не сказаў пра тваю паездку ў Расію, ці куды ты там ездзіла, усё роўна. Даніэла, напэўна, гэтага б не перажыла. Ты ж вярнулася адтуль зусім іншай. Вочы не тыя, нібы падмянілі цябе ў той Белай Русі... Затым з'явілася Анэта, Анна. Яна так радавалася гэтай дзяўчынцы, штодня паўтарала, што гэтая дакладна будзе — яе. І тут нечакана прыехаў Гюнтэр... Даведаўся, што гэты хлапчына, беларус, заявіўся ў Аараў, сапраўдны бацька тваёй дачушкі. Даніэла ўзарвалася: вылажыла ўсё, як ёсць... І такі трагічны зыход — як дакор мне, маёй даўняй здрадзе. Ды і ці можна той разлад лічыць здрадай? Мы, лічы, разышліся на той перыяд... А я жывы чалавек.

— Тата, а як мне цяпер жыць? — у Мерыям ад пачутага закружылася галава.

Людзвіг пераселў да яе, абняў за плечы.

— Я баюся, тата... Мне страшна згубіць сына. Гюнтэр адмовіўся ад мяне і Анны, а мой Ігар так далёка. Я яго так кахаю... — прашаптала яна ціха, крыху супакойваючыся.

— Жыць, дачушка. Жыць. Свой лёс не абмінеш. Я веру, што так і ёсць, — цвёрда адказаў бацька і пацалаваў дачку ў лоб. — Жыццё само падкажа табе дарогу, мая Мерыям, мая Марыя...

## 5

Навошта ён схлусіў ёй, што кахае? Навошта? Магчыма, яна проста гэта хацела пачуць. А ён, цынік, хлусіў. І гэта чамусьці яго ніколькі не хвалявала.

Было штосьці незразумелае ў гэтых адносінах, без узаемных абавязкаў і папрокаў. Маша звалілася як снег на галаву, у самы разгар гарадскога свята. Чаму ж, як снег на галаву? Запрашаў жа, выходзіць. Два дні яны былі разам: кахалі... І пра заручыны загаварылі неяк само па сабе, на другі дзень. Маша першай завяла размову.

Ігар не спяшаўся. Разумеў, што дзяўчына даўно прыкіпела да яго душой. Машка прыязджала яшчэ і яшчэ, нічога не паведамляючы сваім бацькам. Ігар чамусьці не спяшаўся разбіваць яе надзеі.

Развітваючыся ў чарговы раз, дамовіліся сустрэцца ў Мінску. Ён прыедзе туды па першай яе просьбе. А ў красавіку Ігар, нарэшце, зможа паехаць у Маскву — знаёміцца з будучай цешчай і цесцем. Затым яны вернуцца на Палессе, каб і яго маці пазнаёмілася з будучай нявесткай.

Яніна Іванаўна крыху прыхварэла апошнім часам, але радасць — сынава жыццё наладжваецца — яе паставіла на ногі. Ігар тым часам уладкаваўся ва ўніверсітэт на кафедру прыродазнаўчых дысцыплін, узяўся за кандыдацкую дысертацыю. І дзяўчына добрая, як відаць, знайшлася. Сын, нарэшце, асмеліўся і расказаў маці пра масквічку Машу. Не думаючы занадта, паўтарыў словы будучай нявесты: яго кар›ера як вучонага, дзякуючы няБеднаму, з патрэбнымі сувязямі, цесцю, можа быць больш чым бліскучай.

Аднак на душы сына было няладна, маці ўбачыла гэта ў вачах, і па-ранейшаму занепакоілася. Усё ж нешта не так з ім, штосьці яго гняце. Што, сыночак? Хацела б дапамагчы, але чым... Нават схадзіла ў царкву, каб усё заладзілася. А вярнуўшыся дадому, завяла размову.

— Тваё рашэнне, сынок, я паважаю, і табе жыць. Не год і два — усё жыццё. Упэўнены, што будзеш шчаслівы — жаніся. Галоўнае, каб кахаў і паважаў тую жанчыну, якую назавеш сваёй жонкай...



Маці і сын не ўтойвалі нічога адно ад аднаго, заўсёды былі шчырымі. А тут Яніна Іванаўна западозрыла: сын штосьці не дагаварвае. Нешта не так у яго з незнаёмай ёй рускай дзяўчынкай.

— Ты дарослы чалавек, Ігарок, каб разабрацца ў сабе найперш. Толькі адно скажу: я твайго нябожчыка бацьку дагэтуль люблю. І ён мяне любіў. Ты — дзіця сапраўднага кахання, хоць і позна я цябе знайшла, мне было далёка за трыццаць. Потым нешта зламалася ў бацькавай душы, нейкая спружына... Магчыма, і я вінавата ў нечым: настаўніца, сухар... А мне мякчэй трэба было з ім, ласкавей. Маладзейшы за мяне быў... Не змагла. Ведаю ж цяпер адно: без кахання не створыш сапраўднай сям'і. Я ж стану самай шчаслівай маці, калі Маша будзе з табою па-сапраўднаму шчаслівая, а ты, як мужчына, пастараешся зрабіць усё дзеля гэтага. Для любой маці важна, каб яе дзіця было шчаслівым. Я ж хачу, каб твае пачуцці былі моцнымі... І хвалююся вось яшчэ аб чым. Так, для кожнага вучонага важны кар'ерны рост. Які ж без гэтага вучоны? У цябе ўсё наперадзе, галоўнае, галава на плячах светлая. Можна дасягнуць вышынь хутка, за кошт добрай падтрымкі, падпоркі, пры гэтым і нічога не зрабіць. А можна ўсяго самастойна дабіцца. Але гэта не так хутка. Я хацела б, каб ты і тут не памыліўся. Каханне і кар'ера, бясспрэчна, важныя рэчы ў жыцці чалавека, але што важней — трэба вырашаць толькі самому, каб паважаць самога сябе...

— Мам, як жа ты ўсё ж мяне моцна любіш! Каб жа я ведаў, што Машка сапраўды пакахала мяне, то галавой у палонку. А кар'ера... справа такая, як атрымаецца. Каб жыццё было не ў цяжар, я так разумею...

— А калі сам не кахаеш — ужо няважна? Памыляешся. Сынок, як жа я жадаю табе шчасця. Будзеш ты шчаслівы — і я буду шчаслівай... — у кутках яе вачэй заблішчалі слёзы.

Ён абняў маці.

— Ну, добра, — выцерла незаўважна вугалком хусцінкі слёзы. — Бяжы на вакзал за білетам. Калі ж паедзеш у Маскву?

— Паслязаўтра. А першага мая будзеш прымаць дома сваю будучую нявестку... — усхваляваны, ён пацалаваў маці, і, апрануўшы лёгкую куртку, выйшаў з дома.

Прыемны вячэрні халадок чарговай вясны дзіўна студзіў яго твар. Косціч ніколі ў жыцці не адчуваў нічога падобнага: маці не правядзеш: у нечым сумняваецца, можа, не ўпэўнена, што правільна робіць сын? Ха... Каго ж ён хоча ўвесці ў зман? Ніякага кахання тут не было і не можа быць! Дык каго? Сябе? Машу не назавеш дурніцай. Вырашыла, што пакахаю пасля? І — заплюшчыла вочы на яго швейцарскія прыгоды? Ведала ж... Балбатун-гід прагаварыўся, што іх загадкавы паляшук падаўся да каханай жанчыны. Нечаканае яго знікненне ў самым пачатку для Машы рамантычнай паездкі усё ж такі яе пасля не спалохала: дзяўчына пачала змагацца за сваё шчасце. Не спалохалася, што ў мінскім гатэлі назваў яе іншым іменем. Пасля нават не ўспомніла ніколі. І ён быў удзячны Машы за гэта. Хаця…

Душа Ігара па-ранейшаму імкнулася туды, дзе была тая, іншая, улюбёная ва ўсё славянскае, чужая і такая родная яму жанчына. І зараз перад вачыма — зялёнае прадгор'е Юра, амаль не рэальны старажытны Аарау, залітая сонечнымі вясеннімі промнямі Аарэ і яна, яго мара Мерыям...

Нечакана па шляху да адрэстаўраванага нядаўна чыгуначнага вакзала, які пабудавалі пасля вайны нямецкія ваеннапалонныя, Ігар адчуў нейкі ледзь заўважны зрух у яго душы. Нешта адбывалася ў паветры вакол яго: чамусьці сёння раней звычайнага, ярчэй і нейк задзірыста-весела, загарэліся прывакзальныя ліхтары, а ў краіне толькі і чуеш пра эканомію... Мясцовая дзятва весялей гуляла ў футбол на стадыёне, які, здавалася, стагнаў ад задавальнення — кожны ўдар па ім гулкім рэхам адбіваўся ў спальных мікрараёнах. Была ж пятніца, і побач, падаючы сігналы рэдкім гараджанам, рабіў круг гонару па дарожнаму кальцу вясельны аўтамабільны картэж, і жыхары віталі нараджэнне новай сям'і. Ігар усміхнуўся: па традыцыі, нават міліцыя не ўмешвалася ў гэтыя самавольныя



змяненні, унесеныя закаханымі ў правілы дарожнага руху. Здавалася Косцічу, усё ж штосьці такое з'явілася ў паветры, чым ён не мог надыхацца, ён быў так усхваляваны і незвычайна шчаслівы. Нейкая пакуль невытлумачальная перамена адбылася ў родным маленькім горадзе і ў ім самім...

Білет на міжнародны беларуска-расійскі цягнік, што курсіраваў праз іх гарадок, на шырокім пероне Ігар вывучаў вельмі ўважліва. Паслязаўтра ўсё павінна змяніцца ў яго жыцці. Паслязаўтра. Новы паварот у яго жыцці.

«Ці правільна ён робіць?»

Гэта было пытанне, якое Ігар задаваў і задаваў сабе ўжо не раз, стоячы на пероне. Да таго часу, пакуль не падуў лёгкі свежы ветрык, які прынёс пяшчотна-густы пах, што здаўся яму такім шчымліва-знаёмым.

Мужчына натыкнуўся вачыма на невысокае дрэўца, што схавалася сярод высокіх дрэў суседняга з вакзалам невялікага парку і скалануўся: чаромха! Дык гэта яна пахне!!! Няўжо гэты пах будзе пераследаваць яго ўсё жыццё?! Няўжо ад яго нікуды не схавацца?

Прыбываў пасажырскі поезд «Брэст-Масква». У гэты ж час, паслязаўтра, ён панясе і яго, Ігара Косціча, у залатаглавую. У вокнах вагонаў мільгалі пасажыры. Маладыя хлопцы, як толькі сімпатычныя праваднiцы ступілі на перон, накіраваліся ў гандлёвую кроку, што нядаўна прыклеілася да чыгункі. Ігар яе раней і не заўважыў: калі толькі паспелі пабудаваць?

«Што ж, час дадому...» — падумаў Косціч і раптам рукавом зачапіўся за галінку чаромхі. Нейкі добры чалавек, відаць, падняў яе з зямлі і ўтыркнуў між адтулін у цаглянай агароджы.

Без патрэбы скалечаная некім, пышная чаромхавая галінка зверху ўжо буяла квеценню, а знізу белыя пялёсткі толькі распускаліся. Божа, які пах зыходзіў ад яе! Ажно галава закружылася... Косціч вырашыў аднесці яе дадому, каб прадоўжыць на некалькі дзён ёй жыццё: вясна ж толькі збіраецца ў сілу.

— Косціч, ты ўсё ж такі непараўнальны рамантык! — да болю знаёмы жаночы голас пачуўся аднекуль збоку.

Ён азірнуўся...

Не, гэта не сон. Адыходзячы цягнік і тая жанчына, з якой толькі што ў думках развітваўся і якую мог бы чакаць усё сваё жыццё. Яна — гэта мроя, няпраўда! — тут, у Міткавічах. Неверагодна, але факт. «Чаго ж ты стаіш, дурань?»

Мужчына, не адчуваючы пад сабой ног, кінуўся да Мерыям...

Чаромхавая галінка, выпадкова патрапіўшая яму ў рукі, аказалася паміж імі. Яго сэрца, здавалася, выскачыць ад шчасця з грудзей. І раптам Ігару сцяла дыханне. Жанчына была не адна: на руках яна трымала паўсоннае, не больш года, з такімі знаёмымі ямачкамі на шчоках, дзіця.

— Скажы яшчэ раз, што кахаеш мяне! Скажы тое, чаго я не магла пачуць у Аарау... — па твары Мерыям паліліся слёзы. — Скажы, што ты чакаў мяне і рады бачыць тут, пазнаёміцца са сваёй дачушкай, маленькай Анэтай-Аннай... Скажы, што я зрабіла хоць што-небудзь у жыцці правільна? Хутчэй толькі, не маўчы...

Ігар не мог прамовіць ні слова. Язык, здаецца, прыкарэў да нёба. Ён проста прыгарнуў да сябе каханую і сваё дзіця так моцна, нібы больш ніколі не збіраўся адпускаць. Нарэшце, на яго вачах таксама выступілі слёзы шчасця.

— Я проста паміраю ад кахання да цябе... І да нашай маленькай дачушкі. Толькі нас чакае яшчэ адзін чалавек...

Ён пацалаваў абедзьвюх сваіх жанчын — пяшчотна, ласкава. Касціч яшчэ не да канца верыў у сваё шчасце.

... Позна вечарам на гэтым самым месцы прыбіральшчык знайшоў скамечаны дарагі білет. У Маскву.